Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 185 (5018)
ЖНІЎНЯ
21
АУТОРАК
1934 г.
год выдання XVI

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ПЕРШАМУ ВЫПУСКУ КОМСАМОЛЬСКАГА АДДЗЯЛЕННЯ ВКСГШБ ІМЯ ЛЕНІНА

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР шле большэвіцкае прывітанне першаму выпуску комсамольскага аддзялення Вышэйшай Комуністычнай сельска-гаспадарчай школы Беларусі імя Леніна.

Вы з'яўляецеся комсамольскім атрадам арганізатараў буйнай социялістычнай сельскай гаспадаркі, падрыхтаваным партыяй і комсамолам у Комуністычнай школе.

Перад вамі стаіць адказная задача арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў і практычнага ажыццяўлення лозунга тав. Сталіна «Зрабіць усе калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі».

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР упэўнены, што першы комсамольскі атрад выпускнікоў ВКСГШБ па-большэвіцку будзе змагацца за ажыццяўленне рашэнняў XVII з'езда ВКП(б) і ўказанняў вялікага правадыра партыі і рабочага класа тав. Сталіна.

Няхай жыве комуністычная партыя і яе правадыр т. Сталін!

Няхай жыве ленінскі комсамол!

ПРЭЗІДЫУМ ЦВК БССР.

ЗАДАВОЛІЦЬ ПРАГНАСЦЬ КУЛЬТУРНАГА ЖЫЦЦЯ

Усяго паўтара года прейшло з таго часу, як тав. СТАЛІН на першым Усесаюзным з'ездзе калгаснікаў-ударнікаў абвясціў гістарычны лозунг: «ЗРАБІЦЬ УСІХ КАЛГАСНІКАЎ ЗАМОЖНЫМІ». І ўжо за гэты кароткі тэрмін лозунг калгаснай заможнасці не толькі стаў найбольш папулярным сярод шматмільённых мас калгаснікаў, но толькі ўзняў гэтыя масы на чэсную, ударную калектыўную працу, але стаў і прамой РЭАЛЬНАСЦЮ СЁНЕШНЯГА ДНЯ.

Высокая ацэнка працадня мінулага года, бліскучыя паказальнікі сёлетняга калгаснага ўраджаю, невычарпальны магчымасці росту даходнасці калгасаў жывёлагадоўлі, поўная ўпэўненасць калгаснікаў у заўтрашнім дні—ўсё гэта ўжо сёння ўзнімае калгасніка «да ўзроўню людзей, карыстаючыхся багаццем прадуктаў і вядучых зусім культурнае жыцці» (СТАЛІН).

Паспяховае ажыццяўленне ленінскай нацыянальнай палітыкі прывяло да вырашэння самых асноўных элементарных патрабаванняў культурнага жыцця. Такія суседства-і-старычнага значэння перамогі, як пагалоўная граматнасць усяго насельніцтва БССР, як охап школамі ўсіх дзяцей школьнага ўзросту і ўвядзенне абавязковага сямігадовага навучання, як існаванне хаты-чытальні ў кожным сельсавеце і выданне друкаванай газеты ў кожным раёне,—сталі звычайным з'явішчам, УВАЙШОЎШЫМ У ШТОДЗЁННЫ БЫТ КАЛГАСНІКА. Зараз перад намі стаіць яшчэ больш павышаныя задачы. Зараз трэба задаволіць тую велізарную прагнасць культурнага жыцця, якая ўсё мацней і мацней праўляе сябе ў новай калгаснай вёсцы.

Калгаснік хоча і можа жыць У ЧЫСТАЙ ХАЦЕ І ДОБРА УПАРАДКАВАНАЙ ВЁСЦЫ. Надарма санітарны паход, які быў аб'яўлен палітаддзелам ДРЫСЕНСКАЙ МТС, выкаваў шырокі санітарны актыў калгаснікаў і калгасніц. Паход пачаўся з прывядзення ў культурны стан хат. Былі адрамантаваны і вычышчаны дымаходы, асовіяхімаўцы знішчалі клапоў і тараканаў, калгасніцы абвясцілі спаборніцтва на чыстую падлогу. У планавым парадку прайшоў па зоне МТС РАМОНТ ЛАЗНЯЎ. З далейшым разгортваннем паходу ў калгасах «Верны шлях», «Комінтэрн», імя Будзённага, імя Леніна і многіх іншых пачалося шырокае БУДАЎНІЦТВА ПРЫБІРАЛЬНЯЎ.

Гэты прыклад варты пераймання. У кожным калгасе павінен вырасці сталы санітарны актыў, новыя ЗНАТНЫЯ ЛЮДЗІ—ударнікі барацьбы за чыстату і добрабыт. Гэты актыў павінен узначальваць парторг, вядучым ядром у ім павінны стаць комсамольцы. Трэба памятаць, што чыстата ў хаце—гэта самая першая, самая элементарнейшая адзнака заможнага культурнага жыцця. Таму пытаннямі соцспаборніцтва калгасніц не чыстую хату варта заняцца кожнаму райкому партыі, кожнаму палітаддзелу.

Кіруючыя арганізацыі раёна абавязаны рашуча павярнуць каперацыю і ўсю гандлёвую сетку наогул НА ЗАДАВАЛЬНЕННЕ ЎЗРОСШАГА КУЛЬТУРНАГА ПОПЫТУ КАЛГАСНІКА. Тое рэзкае размежаванне на «гарадскі» і «сялянскі» асартымент, ад якога нашы каператары вельмі туга адвыкаюць, цяпер толькі выклікае справядлівыя папрокі ў няўменні гандляваць і няведанні попыту спажыўца.

Добрасумленна і чэсна працуючы на калгаснай вытворчасці ўдарнік, дабіўшыся высокай ўраджайнасці і даходнасці калгаснай гаспадаркі, атрымаўшы па сваіх працаднях багацце прадуктаў, бярэцца за ПРЫВЯДЗЕННЕ СВАЁЙ ХАТЫ Ў КУЛЬТУРНЫ ВЫГЛЯД. Ён жадае абкласіць сцены ДОБРЫМІ ШПАЛЕРАМІ, падабраўшы па свайму густу копер і малюнак іх. Ён жадае набыць ШАФУ, жалезныя ложкі (да таго-ж з нікельнымі шышкамі). Ён патрабуе прыгожага і зручнага «гарадскога» НАЧЫННЯ.

Усё гэта наша прамысловасць выпускае ўсё больш і больш. Трэба толькі, каб гандлёвыя арганізацыі зверху да нізу—ад Белгандля і Белкаапсаюза да вясковай крамы і ларка—клапаціліся і чула адносіліся да задавалення попыту калгаснага спажыўца. Прымяніўшы леташні вопыт заключэння ДАГАВАРОЎ ПАМІЖ КАЛГАСАМІ І КААПЕРАЦЫЯЙ, трэба сёлета больш жорстка прасачыць, каб каператары ВЫКОНВАЛІ свае абавязацельствы аб завозе таварў, перапічаных у дагаварах.

Зразумела, упрыгожанне і культурнае абсталяванне хаты самацёкам не пойдзе. Партыйныя арганізацыі, палітаддзелы, комсамольцы, незавы друк павінны накіроўваць калгасныя масы, прывіваць калгаснікам культурныя навыкі, павышаць іх патрабавальнасць да сябе і да сваёй хаты.

Асабліва востра павінна быць пастаўлена пытанне аб БУДАЎНІЦТВЕ КАЛГАСНАЙ ЛАЗНІ. Ад старой вёскі нашы калгасы атрымалі ў спадчыну самы прымітыўны тып лазні, нярэдка абмяжоўваючы наведвальніка толькі «сухім парам». Нават і такіх лазняў зусім недастаткова па колькасці. Пабудаваць прасторную і добрую лазню—справа зусім няцяжкая. Тут неабходна толькі, каб калгасы правялі ініцыятыву і каб партыйныя і комсамольскія арганізацыі гэту ініцыятыву абудзілі і ўзначаліці. Патрэбна таксама, каб райвыканкомы і сельсоветы не пашкадавалі некаторай колькасці пнёў з лясоў мясцовага значэння (калі ў калгасе няма будынка, які можна перабстэляваць пад лазню).

Яшчэ менш складаная, але вельмі і вельмі патрэбная справа, гэта арганізацыя КАЛГАСНЫХ ЦЫРУЛЬНЯЎ. Невыпадкова комсамольцы зоны ВЕТРЫНСКАЙ МТС пачалі свой культпаход з таго, што падстрыглі ўсіх калгасных дзяцей. «Чырвоны крыж» звычайна ў час пасеўнай і ўборачнай пасылае ў вёску не калькі перасовачных цырульняў. Ці не пара ўжо гэтыя цырульні замацаваць у буйных калгасах на ўвесь час?

Бадай найбольш надзённай і назраўшай з'яўляецца праблема КАЛГАСНАГА КЛУБА. Іменна калгасны клуб, побач з хатай-лабараторыяй і брыгаднымі ленінскімі куткамі, заклікан стаць цэнтрам культурнага жыцця вёскі.

Цяга калгаснікаў да культурнага скарыстання адпачынку і да мастацкай самадзейнасці добра вядома кожнаму. Бяда ўся ў тым, што мы яшчэ не ўзяліся як належыць за ПАДРЫХТОЎКУ КІРАЎНІКОЎ калгасных клубаў і асобных галін клубнай работы. Паказальны такі факт. У Дрысенскім раёне быў праведзен злёт гарманістаў, але ні калгаснікі, ні арганізатары злёта не былі задаволены вынікамі: рэпертуар выканаўцаў аказаўся занадта прымітыўным, маламастацкім. А дайце гэтым гарманістам, сярод якіх ёсць нямала талановітых музыкаў, добрага культурнага кіраўніка—і зусім паіншаму загучаць тыя-ж гармонікі.

Мы навучыліся надрэнна падрыхтоўваць і павышаць кваліфікацыю работнікаў розных галін калгаснай вытворчасці. ТРЭБА ПРЫНЯЦЦА І ЗА ПАДРЫХТОЎКУ РАБОТНІКАЎ РОЗНЫХ ГАЛІН КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ. НЕАБХОДНА ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ УЗНІКНЕННЕ СОЦЕНЬ І ТЫСЯЧ НОВЫХ ДРАМАТЫЧНЫХ ГУРТКОЎ, АРКЕСТРАЎ, ХОРАЎ, ФІЗКУЛЬТУРНЫХ арганізацый. Неабходна ПАВЫСІЦЬ ТЭХНІЧНЫ І МАСТАЦКІ ЎЗРОВЕНЬ ужо існуючых.

І побач з развіццём і мастацкім ростам масавай калгаснай самадзейнасці кожная раённая партарганізацыя і кожны палітаддзел павінны ўжо сёння прыняцца за стварэнне з найбольш здольных членаў калгасных гурткоў РАЁННЫХ ПЕРАСОВАЧНЫХ МАСТАЦКІХ БРЫГАД для сістэматычнага абслугоўвання калгасаў. Нашым сталым тэатрам трэба значна больш і часцей пасылаць свае брыгады ў калгасы ў парадку культурнага шэфства над імі. Ранейшы вопыт у гэтай справе, той гарачы гасцінны прыём, які ўсюды сустракалі акторы, найлепшы водгукі глядача паказваюць як высока цэняць калгасныя масы социялістычнае мастацтва, якая вялікая іх прагнасць да добрага мастацкага відовішча. Разам з тым трэба нашым тэатрам падумаць і аб перайманні каштоўнейшага пачыну маскоўскага Малага тэатра, які арганізаваў свой сталы соўгасна-калгасны філіял у сяле Заметчына.

Сёння ўжо мала КОЛЬКАСНАГА размаху. Калгаснік патрабуе і ВЫСОКАЙ ЯКАСЦІ культурнага абслугоўвання. Надарма асабліва многа і горача крытыкуецца ў калгасах работа Белдзяржкіно і БАКТ'а.

КІНОПЕРАСОЎКА — не навіна нават у самай аддалёнай вёсцы. Праўда, колькасць гэтых перасовак яшчэ далёка не задавальняе патрэбнасці. Але ўсё больш і больш раздаецца нараканняў на тое, што Белдзяржкіно ў сваю вясковую сетку дасылае звычайна найбольш старыя страпаныя карціны. А калгаснік хоча бачыць ВЫСОКАМАСТАЦКІ ФІЛЬМ, яго мастацкі густ узрос, падняўся да ўзроўню патрабаванняў гарадскога глядача.

Тое-ж з ЛІТАРАТУРАЙ. Гэта-ж не выпадковасць, што чытка «Поднятой целины» Шолахава была ўключана ў навучальны план кароткатэрміновых курсаў калгаснага партактыва ў БЫХАЎСКІМ РАЁНЕ. Гэта-ж вельмі паказальна, што ў палітаддзелы прыходзяць са скаргамі не тое, што ў кіёсках БАКТ'а і ў бібліятэках дамоў соцкультуры нельга знайсці такіх кніжак, як «Капитальный ремонт» Собалева і «Я жгу Париж» Ясенскага! Побач з масавай папулярнай палітычнай сельска-гаспадарчай брашуркай, па паліцах сельскай каапераціі і вясковых бібліятэк павінны з'явіцца і грунтоўныя работы класікаў марксізма-ленінізма і лепшыя ўзоры сусветнай і совецкай мастацкай літаратуры.

Калгасная вёска—гэта ўжо не вёска мінулых гадоў. Гэта вёска, у якой з'яўляюцца забрукаваныя вуліцы, будуюцца паркі культуры і адпачынку. Гэта вёска, якая ідзе да высокакультурнага жыцця. За наладжванне высока-культурнага абслугоўвання калгаснай вёскі павінны па-сапраўднаму узяцца РК, РВК, палітаддзелы, кожны парторг і сельсавет, кожная комсамольская арганізацыя, уцягваючы ў гэта шырокія калгасныя масы, асабліва калгасную моладзь.

АЗІМАЯ СЯЎБА З'ЯЎЛЯЕЦЦА ЗАРАЗ НАИБОЛЬШ АДКАЗНЫМ УЧАСТКАМ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫХ РАБОТ

ОРША

КАЛГАС „ВЫЗВАЛЕННЕ ЖАНЧЫН" ВЫКАНАЎ ПЛАН СЯЎБЫ

Калгас «Вызваленне жанчын», Праз'зецінскага сельсавета, 17 жніўня поўнасцю выканаў план асенняй сяўбы на плошчы ў 87 гектараў.

Па сяўбе азімых кожная брыгада мела штодзённае аператыўнае заданне. Праўленне калгаса штодзённа правярала выкананне заданняў і сачыла за якасцю работы.

Увесь пасеў жыта і пшаніцы праведзен на ўгноенай глебе.

Чысты пар падвойваўся. На залятых парах спачатку праводзілі лушчэнне, а потым узорвалі на поўную глыбіню.

Кожны падрыхтаваны да сяўбы і засеяны гектар быў два разы праверан інспекцыяй па якасці.

Старшыня калгаса
ШАСТОЎСКІ.

Брыгадзіры:
ЛЕВІН, ПАЦЕМКІН, ДЗЯРЖАЦКІ, ШУТ ЦІХОН.

Комсамольскі арганізатар
ШАРАНДА.

ЧЭРЫКАЎ

ДА ЧАГО ПРЫВОДЗІЦЬ ПАГОНЯ ЗА РЭКОРДАМІ

У Чэрыкаве складаюць зводкі аб хлебапастаўках. Паміж лічбамі зводкі і фактычным паступленнем зярна—вялікая розніца.

Так па зводцы на 1 жніўня лічыцца, што калгасы Рэчыцкага сельсавета здалі дзяржаве 62,6 % гадавога плана. А ў сапраўднасці гэтыя лічбы цалкам хлуслівыя. Вось як «зроблены» гэтыя 62,6 проц.

Нам. дырэктара вінбровара, комуніст—Доменчук загаварыўшыся з прыёмшчыкам Заготзярно Очтовым, выдаў квітанцыю старшыні калгаса «Гігант», Рэчыцкага сельсавета Чарткову на 33 тоны збожжа, якое фактычна на склад не паступіла. Другую квітанцыю Доменчук выдаў старшыні калгаса «2-я пяцігодка» Якушэнку на 12 тон збожжа, якое не толькі не паступіла на склад, а нават не было яшчэ абмалочана. 3-я квітанцыя выдана старшыні калгаса імя Будзённага—Бопарчанка на збожжа, якое таксама не паступіла. Карацей кажучы, Доменчук выдаў фіктыўныя дакументы большасці калгасам Рэчыцкага сельсавета. У той-жа час у калгасах размяркована звыш 50 проц. намалочанага збожжа.

Ці ведалі раённыя арганізацыі аб гэтых антыдзяржаўных махінацыях? Да, ведалі. Ведаў упаўкамдутыя заг СНК тав. Іофе, ведалі нам. сакратара РК тав. Матросаў і старшыня РВК тав. Ратайка. Ведалі і ўсё-ж такі ўключылі міфічнае збожжа ў зводку. Гэта замест таго, каб прыцягнуць да стражайшай адказнасці вінаватых у прамым абмане дзяржавы.

У раёне забыліся аб арганізацыі збожжапаставак у аднаасобным сектары. У многіх сельсоветах аднаасобнікі яшчэ не прыступілі да здачы збожжа дзяржаве, зярно разбазарваецца направа і налева. Так, у вёсцы Ржавец, Шароеўскага сельсавета звыш 10 гаспадарак поўнасцю ўбралі сваё жыта і ячмень, памалолі ўвесь хлеб, не здаўшы дзяржаве ніводнага фунта.

У Рэчыцкім сельсавеце выяўлена 12 аднаасобных гаспадарак, якія засеялі ад 2 да 6 га і якім не даведзены абавязацельствы па пастаўках. Сярод іх ёсць і заможнікі (Маршалко, Таўпыга), якія з года ў год сабатуюць хлебаздачу.

АРЦЕМ СТАЛЬ.

АД РЭДАКЦЫІ:

Змяшчаючы пісьмо чэрыкаўскага карэспандэнта, «Звязда» чакае, што пракуратура рэспублікі неадкладна прыцягне да крымінальнай адказнасці злачынцаў, ашукваючых дзяржаву.

«Звязда» адначасова просіць партколегію Камісіі партыйнага кантроля па БССР ўмяшацца ў гэту справу і прыцягнуць да партыйнай адказнасці Даменчука і яго апекуноў.

КРУПКІ

„АД СЯЎБЫ ПАКУЛЬ УСТРЫМАЦЦА"

Калгасы «Польшча», «Правда», «Шлях Сталіна» і «Большэвік» атрымалі ад дырэкцыі МТС дырэктыву «ад сяўбы пакуль што ўстрымацца».

Прычына вельмі простая. Сяўба азімага кліну ў гэтых калгасах павінна праводзіцца выключна гатунковым насеннем. А насенне своечасова ў раён не завезена. Толькі сёння прыбыла на станцыю 320 цэнтн. жыта «вятка». А з 51 цэнтн. пшаніцы маскоўскай не завезена яшчэ ні кілограма.

Наркамзем пацяшае паперкамі, што пшаніца будзе завезена ў раён часткова ў жніўні, часткова ў верасні. І гэта ў той час як сяўба азімай пшаніцы павінна быць скончана да 1 верасня.

Я. ІВАШЫН.

БЫХАЎ

У БЫХАВЕ НЕДАВЕДЗЕНЫ ПЛАН СЯЎБЫ

Прайшло два дні з таго часу, калі павінна была пачацца азімая сяўба. Між тым калгасы зоны Быхаўскай МТС яшчэ нават не рыхтуюцца да сяўбы. Ні ў адным калгасе яшчэ не ведаюць, колькі і дзе прыдзецца сеяць. Такое абураючае становішча з'явілася ў рэзультаце таго, што кіраўніцтва МТС да гэтага часу яшчэ не давяло калгасам план азімай сяўбы і не далі на гэты конт ніякіх указанняў.

Аб гэтым ведаюць у палітаддзеле і ў райкоме партыі, але ніякіх мер не прымаюць.

КІПЕР.

БЯЧНЫЦЫ

ПРЫСТУПІЛІ ДА СЯЎБЫ АЗІМЫХ

Перадавыя калгасы зоны дзейнасці Старобінскай МТС прыступілі да сяўбы азімых. Калгас «Перамога» за першы дзень пасеяў 5 гектараў пшаніцы, калгас «Перадавік» — 10 гектараў, «Чырвоная зорка» — 6 гектараў, «Ясная раніца» — 4 гектары, «Свабода» — 10 гектараў.

Падрыхтавана глеба пад пасеў жыта.

Рэдактар палітаддзельскай газеты ГУРЭВІЧ.

ІЛЬНАТРАПАЛКА СЯБЕ АПРАЎДАЛА ПОЎНАСЦЮ

Палітаддзел да пачатку перабленння вялікую ўвагу звярнуў на падрыхтоўку машын да ўборкі ільну, паставіў перад сабой задачу, каб у гэтым годзе «Комсамолкі» працавалі на поўны ход.

Палітаддзел стварыў брыгаду па масавай рабоце, у якую ўваходзілі: масавік, аграном, механікі. Брыгада правяла вялікую растлумачальную работу

У гэтым годзе мы разбілі антымеханізатарскія тэндэнцыі пасобных старшынь калгасаў, адначасова палепшылі тэхнічны нагляд за якасцю рамонту машын.

Агрэгат з 2-х «комсамолак» за работай (калгас імя Варашылава, Шклоўскі раён).

Ільнацерабілка «Комсамолка» — машына добрая. Толькі ўся справа ў тым, хто на ёй працуе,—заяўляюць калгаснікі.

Самі калгаснікі выбіраюць лепшыя ўчасткі для механічнага ільнацераблення, толькі каб у іх працавала машына.

Наша МТС на 10 жніўня поўнасцю выканала план механічнага ільнацераблення на плошчы ў 424,4 га. Велізарнае значэнне адыграў усебеларускі конкурс на лепшае скарыстанне ільнацерабільных машын.

У конкурс уключыліся 53 «Комсамолкі». Калі да ўключэння ў конкурс прырост за пяцідзёўку даваў 38-45 гектараў, то за першую пяцідзёўку конкурса прырост дасягнуў 114 гектараў.

Чырвонасцяжны трактар, які трымае пераходны палітаддзельскі сцяг, трактарысты Федцёнкін і Сінякін выйшлі пераможцамі на ільнацераблення — выцерабілі 36,64 гектара. Ільнацерабільніцы Федцёнкін Насця, Бельская Вера, Валенцін Насця перавыконвалі нормы. Комсамольскі трактар № 13 Бубена і Ушакова, таксама перавыконваў нормы, выцерабіўшы 35,95 гектара. Такіх прыкладаў шмат. У спаборніцтве па конкурсу першае месца заняла трэцяя трактарная брыгада (праграваная Палітсектарам і газетай «Звязда» за сяўбу). Замест 68 гектараў, паводле плана, яна выцерабіла 104,77 гектара.

Вопыт гэтага года паказаў, што мы маем усе магчымасці поўнасцю скарыстаць ільнацерабільныя машыны і дабіцца, каб совецкі лён быў лепшым у свеце.

А. КАЛЯДА.

Нач. палітаддзела Баскаўскай МТС.

АНТЫДЗЯЖНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ДЫРЭКТАРА КРАЎЧАНКА

Дырэктар Дрысенскай МТС тав. Краўчанка распараджаецца незаконна збожжам, якое паступае ў лік натураплаты МТС. Ён узяў у калгасе «Пролетарый», Каркалецкага сельсавета, 1000 кіло жыта для МТС, выдаўшы калгасу распіску аб прыёме зярна ў лік натураплаты.

Калі начальнік палітаддзела МТС тав. Плаўнік прапанаваў Краўчанка неадкладна звярнуць узятае зярно, дырэктар пашоў на камбінацыю: ён забраў ад калгаса назад расціску і выдаў новую аб тым, што атрыманае збожжа з'яўляецца застаўшымся ў распараджэнні калгаса для размеркавання калгаснікам з 10 проц. фактычнага абмалоту.

Такая дзейнасць дырэктара МТС з'яўляецца грубым парушэннем дырэктыў партыі і ўрада аб парадку атрымання 5 проц. адлічэнняў натураплаты для патрэб МТС.

Райупаўкамзаг СНК СССР па Дрысенскаму раёну КАЦ.

З ФРОНТА ХЛЕБАПАСТАВАК

Гомельскі колгасгас № 59 на 14 жніўня поўнасцю выканаў гадавое заданне па хлебапастаўках і насеннязыцы.

Дырэктар ГАРАГЛЯД. Нач. палітаддзела БЕРГОВІН.

ПЕРШЫ УСЕСАЮЗНЫ З'ЕЗД СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

У прэзідыуме з'езда злева направа: т.т. ЮДЗІН, ГОРКІ, КІРШОН і інш.

ЗАМЕЖНЫЯ ПІСЬМЕННІКІ АБ З'ЕЗДЗЕ

З хваляваннем і радасцю далучаю я свае апладысменты да тых, хто вітае сёння вялікага ГОРКАГА, нашага піонера рэволюцыйнай літаратуры.

ЖАН РЫШАР БЛОК.

***

Першы з'езд совецкіх пісьменнікаў ёсць спектакль, які патрэбна прадставіць перад вачыма кожнага разумоваго работніка капіталістычных краін. Трэба, каб кожны з іх пачуў прамову т. ЖДАНАВА, каб ён убачыў, як партыя большэвікоў разглядае праблему літаратуры, параўнаць з гэтым аўта-да-фе з кнігі якія робяць у Берліне па загадах Гітлера. І тое і другое характарызуюць дзве культуры: з аднаго боку, варварства капіталістаў і, з другога — перамагаючы социялізм. Мы будзем змагацца за рэволюцыйныя пісьменнікі, для насаджэння ў Францыі совецкай культуры, за перамогу Окцября ў французскай культуры

ЭЛЮІ АРАГОН.

НА ТРЫБУНЕ—ЛЕГЕНДАРНЫ ШМІДТ

(Ад нашага спецыяльнага карэспандэнта «Звязды)

Аб непраходных балотах, ператвораных у квітнеючыя палі, аб дзівосных растках новай паэзіі, аб яркіх вобразах, ажыўшых са старонак Янкі Купалы і Якуба Коласа, аб новых мастаках слова, заваёўваючых літаратуру, аб вершах Харыка, абляцеўшых увесь свет гаварыў з'езду тав. Клімковіч — старшыня праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў Беларусі.

Калі дакладчык закончыў свой цікавы даклад аб маладой квітнеючай літаратуры Беларусі, на трыбуну з'езда вышаў легендарны беларус Шмідт, які пачаў сваю глыбока змястоўную прамову ўпамінаннем аб родным краі.

— Я тут не прадстаўляю літаратуры якой-небудзь рэспублікі, і таварышы беларусы, я выступаю пасля прадстаўніка літаратуры Совецкай Беларусі.

Сёння з вуснаў Отто Юльевіча з'езд даведаўся, што на дрэйфуючай ільдзіне было яе 104 чалавекінцы, а 105. Сто пятым быў Пушкін. І аб ім гаварыў Шмідт.

У нас быў адзін томік Пушкіна. Баеўскі надзвычай добра чытае. Як чытаў вершы Пушкіна, якія не маюць непасрэдных адносін да дрэйфуючай ільдзіны, але гэтыя вершы часта лепш арганізоўвалі псіхіку, чым голая агітацыя. У людзей з'яўлялася глыбокая вера ў сваё выратаванне, умацоўвалася мужнасць, бадзёрасць, цвёрдасць.

— Нас таксама наведвалі сучасныя пісьменнікі. Па радыё мы атрымалі вершы Лахуці. Калі ў палатах цесляроў чыталі вершы Лахуці, усе песляры даведаліся, што яны героі, што аб іх памятае і гаворыць краіна, мянялася свядомасць, расла гордасць.

Аб вялікай краіне, аб вялікіх тэмах будучых твораў гаварыў з'езду большэвік, вучоны, камісар. Ён успамінае незабываемыя карціны бурнага радаснага спаткання на шляху да Масквы. Ён гаворыць:

— Мы мелі радкае шчасце бачыць любоў радзімы. Гэта перажыванне такой незвычайнай сілы, што яе цяжка выразіць.

— Краіна ў нашым вобразе паказала сябе.

— Не трэба выдумляць, — заклікае Отто Юльевіч: — такіх тэм шмат. Яны на любой будоўлі, у любым калгасе. Гэта вялікая тэма ўзаемаадносін асобы з калектывам не знайшла яшчэ адлюстравання ў літаратуры.

Калі Шмідт ставіць перад з'ездам задачу — паказаць у мастацкіх вобразах праблему новага совецкага кіраўніцтва ва ўсіх галінах, зала адчувае, якая гэта вялікая, складаная і ўдзячная тэма.

Лёдавага камісара — прафесара-рэволюцыянера—змяняюць на трыбуне прадстаўнікі маскоўскіх рабочых — рабочыя завода імя Сталіна, «Шарыкоподшипник», электразавода, ЦАГІ, «Трехгорки», якія паслалі на з'езд сваіх делегатаў выказаць пачуццё любові да літаратуры, да людзей, якія яе твораць.

— Мы любім Шолахава, Гладкова, Фадзеева, асабліва любім нашага дарагога Алексея Максімавіча, — гаворыць рабочы Некрасаў ад імя делегатаў.

Рабочым делегатам ад імя з'езда адказаў Дзем'ян Бедны.

ЛЮБІМАЎ.

ВЫСТУПЛЕННЕ тав. Н. М. ГАЛАДЗЕДА НА УСЕБЕЛАРУСКАЙ НАРАДЗЕ РАБОТНІКАЎ ЛЕСПРАМГАСАЎ

19 жніўня скончыла работу ўсебеларуская нарада дырэктароў леспрамгасаў і іх намеснікаў.

На нарадзе з прамовай аб заданнях лясной прамысловасці Беларусі выступіў старшыня Саўнаркома БССР тав. Н. М. ГАЛАДЗЕД.

Нарада вызначыла канкрэтныя мерапрыемствы па перабудове работы і забеспячэнню выканання ў тэрмін плана загатовак і вывазкі лесу ў III і IV кварталах.

МАСАВЫ ПРЫЛІЎ У КАЛГАСЫ ЛЮБАНЬШЧЫНЫ

ЛЮБАНЬ.

НА АСНОВЕ РАЗГОРТВАННЯ МАСАВАЙ РАБОТЫ Ў КАЛГАСЫ ЗОНЫ ДЗЕЙНАСЦІ ЛЮБАНЬСКАЙ МТС ЗА АПОШНІЯ ДНІ ЎСТУПІЛА 159 БЯДНЯЦКА - СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК.

НАЧПАЛІТАДДЗЕЛА КУРКЕВІЧ.

ПЕРАДАВІКІ ЛЯСНОЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Прапойскі леспрамгас 15 жніўня выканаў гадавы план: па загатоўцы строя на 93 проц. і дроў 103 проц., па вывазцы строя на 100 проц. і дроў 100 проц.

Дырэктар леспрамгаса
САПЕГА.

Гомельскі прарабскі ўчастак гадавы план па здабычы жывіцы выканаў на 101 проц. Бярэм на буксір Чачэрскі ўчастак.

Прараб АНОШКА.

Реткаўскі прарабскі ўчастак гадавы план падсочкі выканаў на 100 проц.

Прараб РАЖДЗЕСТВЕНСКІ.

З'ЕЗД СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

АБ СОВЕЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

З даклада А. М. ГОРКАГА на ўсесаюзным з'ездзе совецкіх пісьменнікаў 17 жніўня

Даклад свой Алексей Максімавіч пачынае з аналізу істокаў сусветнай культуры, з характарыстыкі асноўных форм народнай творчасці дрэўнейшых часоў.

Сенс гэтай творчасці, указвае А. М., «зводзіцца да імкнення працуючых рабочых людзей палегчыць сваю працу, узмацніць яе прадукцыйнасць, узброіцца супроць чатырохногіх і двухногіх ворагаў, а таксама сілай слова, прымнаў заговораў «заклінаньняў», зрабіць уплыў на стыхійныя, варожыя людзям з'явы прыроды».

ХВАЛЁНАЯ КУЛЬТУРА КАПІТАЛІЗМА

«Ісць поўная аснова сядзіцца,—працяжае А. М.—што, калі далучы з свайстарыя культуры будзе напісана у корані крыўдзіцелей,—мы пераканаемся, што роля буржуазіі ў працэсе культурнай творчасці моцна перакуваная, а ў галіне літаратуры — слабіна моцна, і яшчэ больш—у галіне жывапісі, дзе буржуазія заўсёды была работадаўцам і тым самым з'яўлялася законадаўцам. Бур жуазія не мела ў самой сябе і не дае ніякіх да творчасці культуры, і гэту творчасць разумець шы-рэй, чым толькі беспарадкавае раз-ніцё жнівіных—матэрыяльных, бы-вых выгад і развіцё раскопы. Культура капіталізма ні што інш-ае, як сістэма прыёмаў фізічна-ка і маральнага папярэжання і ўма-вання ўлады буржуазіі над свя-там, над людзьмі, багаццямі зямлі і перайнай прыроды. Сенс працэсу развіцця культуры ніколі не ра-ўмеўся буржуазіяй як неабход-насць росту усёй масы чалавец-ва. Відома, што на сіле буржуаз-ай эканамічнай палітыкі кожная сядняя нацыя, арганізаваная як заржава, з'яўлялася варожай, а нямецы—слаба арганізаваныя і асабліва цвятныя—служылі бур-жуазіі як рабы, яшчэ больш бяс-праўныя, чым не ўласныя белакожыя рабы.

У сілы і рабочых было адабрана права на адукацыю,—на развіцё розуму і волі да пазнання жыцця, да змены яго ўмоў, да палягчэння працоўнай абстаноўкі. У школах выхоўваліся і выхоўваюцца толькі паворныя слугі капіталізма, верыючыя ў яго непахіснасць і закончанасць. Аб «выхаванні народу» гаварылі, пісалі, нават хваліліся поспехамі пісьменнасці, але на самой справе раздраблялі працоўны народ, учушалі яму ідэі непрымірымай розніцы рас, нацый, рэлігій.

Гісторыя тэхнічных і навуковых вынаходак багата фактамі супраціўлення буржуазіі нават росту тэхнічнай культуры, фактамі такога супраціўлення агульнавядомы, так-жа, як вядомы і прычыны гэта: таксама жывой рабочай сілы. Скажуць: а ўсё-такі тэхніка расла і дасягнула значнай вышыні, гэта — бясспрэчна. Але гэта тлумачыцца тым, што тэхніка сама нібы прадказвае і ўнушае чалавеку магчымасці і неабходнасці далейшага яе росту.

ГЕРОІ КАПІТАЛІЗМА І ЯГО ЛІТАРАТУРЫ

Пераходзячы да гісторыі буржуазнай культуры, Алексей Максімавіч гаворыць аб гераічным спаміру, з мэтаўчыні думак і пачуццяў у народнай творчасці, падкрэсліваючы, што «найбольш глыбокія і яркія ступкі ўдасканаленыя тыпы ге-роіў створаны фальклорам, вусной творчасцю працоўнага народу»...

... «Значэнне фальклора асабліва яркі асвятляецца параўнаннем Гэты рацэ фантастыкі, асноўнай на пос-ках працы, з цяжкай бядацкай фантастыкай царкоўнай, «житій» літаратуры і нікчэмнай фан-стыкай рыцарскіх раманаў.

Эпас і рыцарскі раман — творцы феадальнага дваранства, а героі — завалаўцелі. Добра тома, што ўплыў феадальнай літаратуры ніколі не быў асабліва значным. Буржуазная літаратура чынаецца яшчэ ў дрэўнасці, егі-цкай «казкай аб злодзеі», яе ходаўжаючы прыкі, рыцарыне, яна нуецца ў эпоху разлажэння царства на змену рыцарскага мана. Гэта — да канца буржу-ная літаратура, і яе асноўны ге-рой — плут, злодзей, потым сыцтык, іншы злодзей, але ко «злодзей-джэнтльмен».

Ні ў драме, ні ў рамане мы не ойдзем тыпаў банкіра, прамыс-ца, ніпіцка, паказаных з той лай мастацтва, з якой літаратура ка, гаты тып «лішняга чалавека». ка не адзначыла таксама трагічна і нарэшце знічайны лёс пай-ноў і тварцоў буржуазнай куль-ры — дзеячоў навукі, мастац-а і выхадцаў у галіне тэх-кі, не адзначыла герояў, якія галіся за свабоду нашай з-пад ыпіёту чужаземцаў, не адзначы-і мыслицеляў аб брацтве ўсіх лю-ей, такіх як Томас Мор, Кампа-ла, Фур'е, Сен-Сімон і іншыя. ё гэта гаворыцца не ў якасці проку. Мінулае—небездакорна,

СНОЎНЫ ГЕРОЙ НАШЫХ КНІГ—ЧАЛАВЕК ПРАЦЫ

— «Мы павінны ўсвоіць, што ша праца мае з'яўляецца ас-ным арганізатарам культуры і цэнтрам усіх ідэй — як тых, якія праляцу вякоў знікалі рашэн-е значэнне працы — крыніцу ных ведаў, так і тых ідэй--Марк-—Леніна—Сталіна—якія ў наш с выхоўваюць рэвалюцыйную ромасць пролетарыяў усіх краін нашай краіне ўзводзяць працу выпішю сілы, якая служыць новай творчасці навукі, мастац-а. Для поспеху нашай работы м неабходна зразумець, адчуць й факт, што ў нашай радзіме со-ялістычна арганізуемая праца поўнісьменных рабочых і прымі-ўнага сялянства стварыла ў ка-ткі тэрмін дзесяці год грандыёз-я каштоўнасці і выдатна ўзброі-ся для абароны ад нападу вора-

Асноўным героем нашых кніг павінны выбраць працу, г. зн. чалавека, арганізуемага працэсамі працы, які ў нас узброен усёй магутнасцю сучаснай тэхнікі чала-века, у сваю чаргу арганізуючага працу больш лёгкай, пралукцыйнай, узводзячага яго на ступень мастацтва. Мы павінны навучыцца разумець працу як творчасць. Творчасць—разуменне, якім мы, ла-таратары, карыстаемся вельмі ча-ста амаль ці маючы права на гэта. Творчасць— гэта тая ступень на-пружанасці работы памяці, калі хуткасць яе работы бярэ з запаса ведаў, уражанняў найбольш выпук-лыя і характэрныя факты, кар-ціны, дэталі—і ўключае іх у най-больш дакладныя, яркія агульна-зразумелыя словы.

Маладая наша літаратура не сю жа пахваліцца гэтай якасцю. За-пас уражанняў, колькасць ведаў нашых літаратараў невялік, і асаб-лівых клопатаў аб папярэдні, па-глыбленні яго не адчуваецца.

НОВЫ ЧАЛАВЕК НАРАДЖАЕЦЦА У КРАІНЕ СОВЕТАЎ

У Саюзе соцыялістычных совецкіх рабоча-сялянскай ўладай заклікана к рабоце будаўніцтва новай культуры ўся маса народана-сельніцтва — адсюль следуе, што адказнасць за памылкі, непаладкі, за брак работы, за ўсе праўленні мяшчанскай пошласці, подласці, двудушша, бесперыцыповасці ўскладаецца на ўсіх нас і кожнага. І значыць, наша крытыка павінна быць сапраўды самакрытыкай і значыць, што мы павінны выпрацаваць сістэму соцыялістычнай маралі, рэгулятара нашай работы, нашых узаемадносін.

Расказваючы аб фактах, якія адзначаюць інтэлектуальны рост рабочага фабрык і ператварэнне вокавога ўласніка ў калектыніста-калгасніка, мы, літаратары, іменна толькі расказваем, вельмі дрэнна паказваючы эмацыянальны працэс гэтых ператварэнняў.

Мы ўсё яшчэ дрэнна бачым сапраўднасць. Нават пейзаж краіны рэзка змяніўся, знікла яго жабрацкая прастасць, блакітнаватая палоска аўса, побач з ёю—чорны кавалак узоранай зямлі, заладзістая істужка жыта, зеленаватая пшаніца, палосы зямлі, зарослай пустазеллем, а ў вогуле,—розна-каляровы смутак усеагульнага раздраблення, разарванасці У нашы дні вялікія прасторы зямлі афарбаваны магутна, аднакаляровы, над сялом і павятовым горадам узвышаецца не царква, а вялізны будынак грамадскага прызначэння, гіганцкія фабрыкі бліскуць багаццем шкла і невялічкія языча сція рознавідныя, нібы цацачныя, даўнія цэрквы пераканаўча гавораць нам аб талантлівасці нашага народу, выражанай у царкоўным зодчастве. У літаратуры няма новага пейзажа, рэзка змяніўшага твару нашай зямлі.

Мне здаецца, што я не памыляюся заўважаючы, што бацькі пачынаюць усё больш клапатліва і пяшчотна адносіцца да дзяцей, і, на мой погляд, гэта зусім натуральна, бо ўпершыню за ўсё жыццё чалавецтва дзеці з'яўляюцца нашчадкамі не прошай, дамоў і мэблі бацькоў, а нашчадкамі сапраўднай і магутнай каштоўнасці—соцыялістычнай дзяржавы, створанай працай бацькоў і матак. Ніколі яшчэ дзеці не ўваходзілі ў жыццё такімі свядомымі і строгімі судзя мі мінулага; і я цалкам веру ў факт, расказаны мне: 11-гадовая турбекулёзная дзяўчынка сказала доктару ў прысутнасці свайго бацькі і, указваючы пальцам на яго: «гэта вось, ён вінават, што я хворая, па 40 год працуе здароўем на ўсякую дрэнь, а потым жаніўся на матцы, ёй яшчэ толькі 27, яна здаровая, ён, бачыце, які нішчасны, вось я і выйшла ў яго».

Ёсць усе прычыны чакаць, што такія разважанні дзяцей не будуць рэдкасцю.

Сапраўднасць дае нам усё больш «сырога матэрыялу» для мастацкіх абагульненняў. Але ні драма, ні раман яшчэ не далі дастаткова яркага вобраза совецкай жанчыны, якая свабодна і выдатна дзейнічае ва ўсіх галінах будаўніцтва соцыялістычнага жыцця. Прыметна на ват, што драматургі стараюцца пісаць як можна менш жаночых ролей. Трудна і аб'ясніць—чаму гэта?

А між тым хоць у нас жанчына сбцыяльна роўнапраўна з мужчынай і хоць яна пасыхова даказвае рознароднасць сваіх дараванняў і шырыню сваёй працаздольнасці,—роўнапраўе гэта вельмі часта і ў многім з'яўляецца знадворным, фармальным. Мужчына усё яшчэ не забыў, або ўжо дачас на забыў што на працягу дзесяткаў вякоў жанчына выхоўвалася для пачуццёвых забаў і як дамашняя жывёліна, здольная іграць ролю «гаспадыні». Гэтую старую і ганебную запазычанасць гісторыі палавіне народу насельніцтва зямлі неабходна было-б акупіць мужчынам нашай краіны ў першую чаргу і ў прыклад усім іншым мужчынам. І тут літаратуры неабходна паспрабаваць паказаць работу і псіхіку жанчыны так, каб адносіны да яе ўзняліся над агульнаразумелымі, мяшчанскімі адносінамі, запазычанымі ў поўнай.

СОВЕЦКАЯ ЛІТАРАТУРА—ШМАТВОБРАЗНА ПА МОВЕ, АДЗІНА ПА ІДЭЁЛАСЦІ

Далей, я лічу неабходным указаць, што совецкая літаратура не з'яўляецца толькі літаратурай рускай мовы, гэта—усесаюзная літаратура. Так як літаратуры брацкіх нам рэспублік, адрозніваючыся ад нас толькі мовай, жывуць і працуюць пры святле і пад добратворным уплывам той-жа ідэі, аб'ядначай увесь раздроблены капіталізмам свет працоўных, — ясна, што мы не маем права ігнараваць літаратурную творчасць нацменшасцей толькі таму, што нас больш. Каштоўнасць мастацтва вымяраецца не колькасцю, а якасцю. Калі ў нас у мінулым гігант Пушкін, адсюль яшчэ не значыць, што армяне, грузіны, татары, украінцы і іншыя плямёны не здольны даць найвялікшых майстроў літаратуры, музыкі, жывапісі, зодчества. Не варта забываць, што на ўсім прасторы Саюза соцыялістычных Рэспублік хутка развіваецца працэс ахраджэння ўсёй масы працоўнага народа «да жыцця чэснага—чалавечага», па свабоднай творчасці новай гісторыі, да творчасці соцыялістычнай культуры. Мы ўжо бачым, што чым далей наперад, тым больш магутна гэты працэс выяўляе схаваныя ў 170-мільённай масе здольнасці і таланты.

Я знаходжу патрэбным паведаміць вам, таварышы, пісьмо атрыманае мною ад аднаго татарскага літаратара.

«Вялікая Окцяброская рэволюцыя дала нам, пісьменнікам з прыгнечаных і адсталых народаў, неабмежаваныя магчымасці, у тым ліку і магчымасць выступіць у рускай літаратуры са сваімі, праўда яшчэ далёка недасканалымі, творамі. Нас, пісьменнікаў нацыяналаў, якія друкуюцца на рускай мове, як вам вядома, ужо дзесяткі і нават сотні

«На вялікі жаль гэта разуменьне не ўсе пісьменнікі, крытыкі і рэдактары. Таму так званая апрабаваная літаратурная грамадскасць у цэнтры прадаўжае глядзець на нас, як на «этнаграфічны экспанат». Не ўсе выдавецтвы прымаюць нас да выдання з ахвотай. Не каторыя часта пры прыёме рукапісаў даюць разумець, што мы з чўлнемся для іх «накладныя выдаткі», або «прымусовым асартыментам», што яна «свядома робіць скідку нацыянальнай палітыцы партыі». Гэтыя «мовы благародства» зусім справядліва лаюць у нас пачуццё інтэрнацыянальнага адзінства і свядомасць поўнацэннага чалавека. Крытыка па выхаду твору з друку, у лепшым выпадку абмяжоўваецца парай «цёплых славечак» па адрасу аўтара і кнігі, зноў-такі не столь-к па заслугах, колькі з «павагі» да ленінска-сталінскай палітыкі. Гэта таксама не выхоўвае нас, а, наадварот, на некаторых мала спакушаных гаварышоў дзейнічае дэмабілізуюча і разлагаюча.

Бадай, вам гэтым пісьмом гатовы надасцца прадстаўнікі літаратур усіх саюзных рэспублік і аўтаномных абласцей. Гісторыкі і крытыкі нашай літаратуры павінны звярнуць увагу на гэта пісьмо і пачаць работу, якая ўнушыла-б людзям нашай краіны, што хоць яны розналяцённыя, рознакоўныя, але усе і кожны з іх—грамадзяне першай у свеце соцыялістычнай дзяржаўнасці.

Папрок, адрасаваны нашай крытыцы, мы павінны прызнаць справядлівым папрокам. Крытыка асабліва газетная, найбольш чыта-емая пісьменнікамі,—крытыка наша не талантліва, схаластычна і малаграматна ў адносінах да бягучай сапраўднасці. Мікрэнасць кніг на-газетных ведаў асабліва ярка агаляецца ў нашы дні хуткай змены сапраўднасці, багацця розна-відных дзеянняў. Не каючы, не выпрацаваўшы адзінай кіруючай крытыка-філасофскай ідэі, карыстаючыся ўсё адтымі і тымі-ж цытатамі з Маркса, Энгельса, Леніна, крытыка амаль ніколі не выходзіць у адзоўны тон характараў, і ўзаемадносін людзей з фактаў, якія дае пенасрэдзнае жыццё. У нашай крытыцы, і рабоце ёсць шмат такога, чаго, безумоўна, не мелі пра дугледзець Маркс-Энгельс. Крытыка гаворыць аўтару «Гэта зроблена нашчэльна, таму што вашы настаўнікі гаворыць адносна гэта-га так-та». Але яна не можа сказаць: «Гэта — няправільна, таму што факты супрэчнасці сустрэ-каць паказанняў аўтара». З усіх тужых думак, якімі карыстаюцца крытыкі, яны, відаочна, зусім забылі каштоўнейшую думку Энгельса «Наша кучанне—не догма, а кіраўніцтва да дзеяння». Крытыка недастаткова дзейна, пікна, жы ва і, урэшце, крытык не можа навучыць аўтара пісаць проста, яр ка, эканомна, бо сам ён піша многаслоўна, тускла і — што яшчэ горш—або абыякава, або-ж вельмі горача,—апошняе у тым выпадку, калі ён кажа з аўтарам асабістыя сімпатыкі, а таксама інтарэсы групкі людзей, захваро-ўшых «вожыцкім», прыліпчывай хваробай мяшчанства.

ВЫКАРЧАВАЦЬ МЯШЧАНСТВА З НАШАЙ ЛІТАРАТУРЫ І КРЫТЫКІ

Крытыка ўступае вельмі шмат месца поўтраматным рэцэнзентам, якія выклікаюць толькі непаразуменні і пакрыўджанні аўтароў, але вядомы чаму-небудзь навучыць. Не заўважаюць спроб уважкрасіць і ўвесці ў жыццё некаторыя ідэі народніцкай літаратуры, і ўрэшце—што вельмі важна—не цікавіцца ростам літаратуры абласной, не гаворачы аб саюзнай. Неабходна яшчэ сказаць, што крытыка не вранаецца публічных паведамленняў літаратараў аб тым, «як яны пішуць». А гэтыя паведамленні вельмі патрабуюць увагі крытыкі.

Самакрытыка неабходна, таварышы. Мы працуем перад тварам пролетарыята, які, становячыся ўсё больш граматным, бесперапынна павышае свае патрабаванні да нашага мастацтва, а разам з гэтым і да нашых соцыяльных паводзін.

Комунізм ідэй не сучадзе з характарам нашых дзеянняў і ўзаемадносін у нашым асяродзі—ува емаднасці, у якіх вельмі сур'ёзную ролю адыгрывае мяшчанства, выражанае ў зайздрасці, у прагнасці, у поплых плётках і ўзаемнай брахні адзін на аднаго.

У Саюзе Советаў мяшчанства ссунута з месца, выгнана з яго гнёзд, з сцэны павятовых гарадоў, развеялася ўсюды і, як мы ведаем, прасачваецца нават у партыю Леніна, адкуль яго выкідаюць пры кожнай партыйнай чыстцы. Усё-ж яно астаецца і дзейнічае як мікроб, які выклікае сарамлівыя захворванні.

Партыйнае кіраўніцтва літаратурай павінна быць строга ачышчана ад усякіх уплываў мяшчанства. Партыйцы ў літаратуры абавязаны з'явіцца не толькі настаўнікамі ідэалогіі, арганізуючы энергію пролетарыята ўсіх краін на апошні бой за яго свабоду, — партыйнае кіраўніцтва павінна явіць усімі сваімі паводзінамі маральна аўтарытэтную сілу. Гэта сіла па-вінна ўнесці ў асяродзе літаратараў перш за ўсё ўсведамленне імі калектыўнай іх адказнасці за ўсе з'явы ў іх асяродзі. Совецкая літаратура, пры ўсёй розкастайнасці яе талантаў і бесперапынна растучай колькасці новых, даравітых пісьменнікаў, павінна быць арганізавана, як адзінае калектыўнае цэлае, як магутны сродак соцыялістычнай культуры.

Саюз пісьменнікаў ствараецца не толькі для таго, каб толькі фізічна аб'яднаць мастакоў слова, але каб прафесіянальнае аб'яднанне дазволіла ім зразумець сваю калектыўную сілу, вызначыць з магчымай яснасцю розна-відасць напрамкаў, не творчасці, не мэтавыя ўстаноўкі і гарантавана злучыць усе мэты ў тым адзінстве, якое кіруе ўсёй працатворчай энергіяй краіны.

Гутарка ідзе, безумоўна, не аб тым, каб абмежаваць індывідуальную творчасць, але каб прадаставіць для яе найпрыгодныя магчымасці далейшага магутнага развіцця.

Соцыялістычная індывідуальнасць, як мы бачым на прыкладзе нашых герояў працы, якія з'яўляюцца кветкаемем рабочай масы,—соцыялістычная індывідуальнасць можа развівацца толькі ва ўмовах калектыўнай працы, паставіўшай перад сабой высачэйшую і мудрую мэту—вызваленне працоўных усяго свету з-пад скажаючай людзей улады капіталізма.

Соцыялістычны рэалізм урунтоўвае быццё як дзеянне, як творчасць, мэта якой—бесперапыннае развіцё каштоўнейшых індывідуальных здольнасцей чалавека дзеля перамогі яго над сіламі прыроды, дзеля яго здароўя і доўгалецця, дзеля вялікага шчасця жыць на зямлі, якую ён, адпаведна бесперапыннаму росту яго патрэб, хоча апрацаваць усю, як прыгожае жыллё чалавецтва, аб'яднанага ў адну сям'ю.

ПОЎНЫМ ГОЛАСАМ І З ВЯЛІКАЙ РАДАСЦЮ АБ НАШЫХ ДАСЯГНЕННЯХ

Сказаўшы столькі многа аб недахопах літаратуры нашай, я абавязан адзначыць яе дастойнасці і заваёвы. Тут у мяне няма месца і часу ўказаць на рэзкую розніцу нашай і заходняй літаратуры, — гэта крапатлівая і працяглая работа, часткова яе асветліць у сваім вострым дакладзе тав. Радэк. Скажу толькі, што для ўсякага бесстароннягa ацэншчыка зусім ясна: наша літаратура апярэдзіла заходнюю навізной тэм, і наіўнію, што многія з літаратараў нашых ацэнены на Захадзе яшчэ больш высока, чым у сябе на радзіме. Аб заваёвах літаратуры нашай я ўжо гаварыў поўным голасам і з вялікай радасцю ў 1930 г., у артыкуле, друкаваным у кнізе «Аб літаратуры», старонкі 52, 54 і ў іншых артыкулах гэтай кнігі. З таго часу прайшло 4 гады напружанай работы. Ці дае гэта работа мне права павысіць ацэнку дасягненняў нашай літаратуры? Права гэта мне дае высокая ацэнка цэлага раду кніг асноўным нашым чытачом—рабочым і калгаснікам. Вам вядомы гэтыя кнігі, а таму я не буду называць іх, скажу толькі, што ў нас ужо ёсць вялікая група жывапісцаў словам, група, якую мы можам прызнаць «вядучай» у працэсе развіцця мастацкай літаратуры».

Гэта група аб'ядная найбольш таланавітых-партыйцаў літаратараў з беспартыйнымі, і апошнія становяцца «совецкімі» не на словах, а на справе, асвойваючы ўсё больш глыбока агульны і агульнапартыі і рабоча-сялянскай, совецкай улады. Не трэба забываць, што рускай буржуазнай літаратуры патрабавалася—лічачы з канца XVIII века—амаль 100 год для таго, каб ўкадарна ўвайсці ў жыццё і сказаць на яго шчыры ўплыў. Совецкая рэволюцыйная літаратура дасягнула гэтага ўплыву за 15 год.

Вышыня патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да мастацка-літаратурных, хутка абнаўляючай сапраўднасцю і культурна-рэволюцыйнай работай партыі Леніна,—вышыня гэтых патрабаванняў тлумачыцца вышэйшай адзінкі значэння якое надаецца партыяй мастацтву, жыццёвай словам. Не было і няма ў свеце прыкладу, у якой галіне і літаратуры карысталіся-б такой таварыскай дапамогай, такімі клопатамі аб павышэнні прафесіянальнай кваліфікацыі работнікаў мастацтва і навукі. Аб гэтай рабоце гаворыць нам не толькі зрэнізацыі ВЕЗМ і Літфуза.

Дзяржава пролетарыяту пакінула вытрымаць тысячы выдатных «майстроў культуры», «інжынераў душ». Гэта необходна для таго, каб вярнуць усёй нашай рабочага народу адборнае і не ўсякае ў свеце права на разнастайную розную, таланты, здольнасці. Гэты намер, практычна ажыццёўлены, ускладае на нас, літаратараў, неабходнасць строгай адказнасці за нашу работу і за нашы соцыяльныя паводзіны. Гэта ставіць нас не толькі ў традыцыйную для рэалістычнай літаратуры пазіцыю «судзяў свету і людзей», «крытыкаў жыцця», але прадастаўляе нам права непасрэднага ўдзелу ў будаўніцтве новага жыцця, у працэсе «змянення свету». Уладанне правам і павінна ўнушыць кожнаму літаратару ўсведамленне яго абавязкаў і адказнасці за ўсю літаратуру, за ўсе з'явы, якія ў ёй не павінна быць.

Зараз я запытаю:

На што арганізаваць з'езд літаратараў і якія мэты ставіць перад сабой будучы саюз?

Калі толькі мэты прафесіянальнага добрабыту работнікаў літаратуры—тады наўрад ці варта было гарадзіць такі грандыёзны гарод. Мне здаецца, што салю шмат не пастаміць нутай сваёй не толькі прафесіянальным інтарэсам літаратараў, але інтарэсы літаратуры ў яе цэлым. Саюз павінен у якой-небудзь меры ўнесці на сябе кіраўніцтва крыкі начынаючых пісьменнікаў, павінен арганізаваць яе, размяркоўваць яе сілы па розных работах і вучыць працаваць з матэрыялам як мінулага, так і сучаснага.

У краіне нашай ідзе работа на «гісторыі фабрык і заводаў». Аказалася, што прыцягнуць да гэтай работы высокакваліфікаваных літаратараў вельмі трудна. Пакуль што з іх добра працуюць толькі паэтэса Шкапская і Марыя Лейбэрг, другія-ж не толькі не кранаюцца сырога матэрыялу, але не знаходзяць часу для рэдагавання апрацаванага.

Мы не ведаем гісторыі нашага мінулага. Маркуецца і часткова пачата ўжо работа па гісторыі ўдзельна-княжскіх і парубежных гарадоў ад часоў іх заснавання да нашых дзён. Гэта работа павінна асвятліць нам у парысах і расказах жыццё феадальнай Расіі, каланіяльную палітыку пасобоўскіх князёў і цароў, развіццё гандлю і прамысловасці,—барацьбу эксплуатацыі сялянства князем, вало-дай, кучцом, дробным непачаткам, царквой і заключыць усё гэта арганізацыяй калгасаў,—акт са-праўднага і поўнага вызвалення сялянства ад «улады зямлі», з-пад прыгнёту ўласнасці.

Нам трэба ведаць гісторыю мінулага саюзных рэспублік. Да гэтых і многіх другіх калектыўных работ можна прыцягнуць сотні пачынаючых пісьменнікаў, і гэта работа дасць ім пырачэйшую магчымасць сканадукацыі, павышэння кваліфікацыі шляхам калектыўнай работы над сырым матэрыялам і узаемнай самакрытыкі.

Нам неабходна ведаць усё, што было ў мінулым, але не так, як аб гэтым ужо расказана, а так, як ўсё гэта асвятляецца вучэннем Маркса-Леніна-Сталіна і як гэта рэалізуецца працай на фабрыках і на палях,—працай, якая арганізуе, якой кіруе новая сіла гісторыі—воля і розум пролетарыята Саюза совецкіх соцыялістычных рэспублік.

Вось якая, на мой погляд, задача саюза літаратараў. Нам з'езд павінен быць не толькі справаздачай перад чытачам, не толькі парадам нашых дараванняў, але ён павінен узяць на сябе арганізацыю літаратуры, справу выхавання маладых літаратараў на рабоце, маючай усесаюзнае значэнне—усебаковага пазнання мінулага і сучаснага нашай радзімы.

Мінск, друкарня «Звязды».

МЕСЯЧНІК КОМУНІСТАЎ

КАЛГАСНЫХ І БРЫГАДНЫХ ПАРТОРГАЎ

ПАРТОРГІ АБ СВАЁЙ РАБОЦЕ

Парторг калгаса «Новае Сорокіна», Крычаўскай МТС, Дандзеў Арсень піша, што сваю работу ў калгасе пачаў з актыва. З ім абгаварылі ўсе чарговыя мерапрыемствы калгаса.

Актыў калгаса з можным шчырнасцю ўдзельнічаўся. Пры дапамозе актыва было вырашчана ў калгасе кукурузы. Рачыцкі, Смітроф і Вішнеўскі 3. якія адказалі за позні выхад на работу. Зараз калгаснікі дружна выходзяць на работу і усходзяць сонца.

У калгасе ўвесь час летніх работ працуе палітгурток.

* * *

Парторг калгаса «Чырвоны бераг», Пішчалавушскага сельсавета, Аршанскага раёна, Бягуце піша, што ў калгасе ўстановлены пераходны сцяг працягвання калгаса і партгрупы вакол якога ведзецца соцсаборніцтва брыгад.

Складзен фонд прэміравання на калгаснае сельгаспрадукт. Наладжана работа з ударнікамі праз спецыяльныя сходы і нарады.

У калгасе добра арганізавана абмеркаванне работы. Калгас паставіў перад сабой задачу ператварыцца ў цытадэль абароны. Для гэтага арганізавана вартавая ахоўная каманда. У калгасе 12 калгаснікаў-вароўшыльніх страхоўку і тры калгаснікі, узнагароджаныя значкамі актывістаў Асавіяхіма.

Уся моладзь калгаса займаецца ў агрэгурэку райсавета Асавіяхіма.

* * *

Парторг калгаса «Спартак», Дрысенскай МТС, Васілеўская Наста піша, што ў калгасе метадамі соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва арганізавана кругласутачная работа на фермах і абмалоту.

Калгас добра справіўся з перабаленнем, жнівам, мочкай і рассціланнем лёну. Лепшыя ўдарніцы, калгаснікі чырвоных нораў Сасноўская Фрося, Сурвіло Ядзя і Васілеўская Параска.

Па прыкладзе калгаснікі атрымалі адзін пудзіны на 7-8 кг. Акрамя таго калгас атрымае за перавыкананне лёну.

Бачачы дружную работу калгаснікаў, рад адказасобнікаў ужо дапамагаюць калгасу, каб уступіць у яго.

Парторг калгаса «Чырвоны Усход» зоны дзейнасці Дамашавіцкай МТС тав. Цайд піша, што добрая арганізаванасць настаўнікаў партыі і ўрада ў брыгадах, канкрэтныя самазабавязкі калгаснікаў далі магчымасць калгасу справіцца з уборачнай.

У гонар шаснаццатагадовага юбілея «Звязды» калгас поўнасцю здаў зернапастаўкі дзяржаве, перавыканаў планы сінасахарня.

* * *

Парторг калгаса «Верны шлях», Асавецкага сельсавета, Любальскага раёна т. Вальсонаві піша, што арганізацыя чырвоных і чорных дошак, рэгулярны выхад газет у брыгадах, спецыяльныя палітдні, барацьба за пярэдніцтва ў спаборніцтве з калгасамі «Шлях социялізма» і «Чырвоны барацьбіт» выхавалі социялістычныя адносіны калгаснікаў да працы.

Гэта дало магчымасць кажнаму паспяхова закончыць уборку і поўнасцю выканаць план хлебапаставак дзяржаве.

ЧАМУ БЫЎ ЗВОЛЕН ГАЛОЎНЫ ІНЖЫНЕР БЕЛЖЫЛСАЮЗА тав. ГЕРЧЫКАЎ?

Ціха і мірна цяпер жыцьцё ў Белжылсаюзе і Менскай будаўнічай рэмонтнай канторы. Служачыя кожны дзень прыходзілі ў 9 гадзін раніцы на работу, а ў чатыры ўходзілі дамоў. Кіраўнік Белжылсаюза ЯЎГЕЕЎ часценька ездзіў у Ленінград у госці да жонкі, часта прагульваўся ў Маскву пад выглядам дзелавых камандзіровак. Доўгі час ніхто і нішто не парушала спакойнага і ласёлага жыцьця белжылсаюзаўскага начальства.

Пісьмо «Белжылсаюза разбурае жыцьцё дзяцей», змешчанае ў «Звязде» 3-га жніўня, як абрушыў Белжылсаюза пачынае ўражэнне разарваўшайся бомбы. Яно з'явілася заклікам да наступлення на праціўніка. Наступленне пачалося ў той-жа дзень. Праціўнікам аказаўся аўтар пісьма—галоўны інжынер Белжылсаюза тав. ГЕРЧЫКАЎ.

Яму дасцца клічка «лятучка», адрыванне работ, лго называюць антысавецкім і антыграмадзянскім элементам. І за ўсё гэта ЯЎГЕЕЎ адным росчыркам пяра звальніе ГЕРЧЫКАВА з работы з запісаннем у яго працоўны спіс.

Пахед не спыняўся. Зволіўшы ГЕРЧЫКАВА, пачалі расправяцца і з другімі работнікамі, якія аб беспарадках Белжылсаюза і прадзелах ЯЎГЕЕВА і КАРНЕЙКІ асмеліліся напісаць у несцяную газету. Аднаму адмянецца загад аб павышэнні зарплаты, другім адкрыта пагражаецца расправай за крытыку.

І самае абураючае ва ўсёй гэтай справе—МАЎЧЫЛІВАЕ ПАТУРАННЕ ГЭТАМУ ПАРТГРУПЫ І ЯЕ КІРАЎНІЦТВА КУРАЛАТКІНА. Партыйная група Белжылсаюза не палічыла сваім абавязкам умяшацца ў справу антыпартыйнага рэагавання Яўгеева на выступленне «Звязды».

Змяшчаючы сёння пісьмо тав. ГЕРЧЫКАВА і матэрыялы нашых карэспандэнтаў, пратэстуючых пісьмо на месцы, «Звязда» спадзяецца, што гэтыя факты ў самым хуткім часе стануць прадметам абгаворвання ўпаўнаважаным Камісіі совецкага кантролю і Менгаркома партыі.

(ПІСЬМО ІНЖЫНЕРА).

Я працую галоўным інжынерам Белжылсаюза з 1933 г. Да гэтага больш 7 год працаваў прарабам у бабруйскім аддзяленні Белдзержбуда.

На адным з пасяджэнняў я выступіў з крытыкай работы Менбудрэмканторы. У адказ на гэта кіраўніх канторы тав. Карнейка пачаў пагражаць мне: «Май-жа на ўвазе, што за кожную малейшую тваю памылку я цябе зраблю». І Карнейка пачаў шукаць дабіцца свайго. А тут і факт падвярнуўся зручны. Я расказаў усё што ведаў аб Карнейку камісіі парткома ў складзе тт. Ерэева, Шантыра і Бразінскага, праверэўшай прысланае «Звяздой» аб ім пісьмо.

Гэта стала вядома тав. Карнейку і з таго часу ён яшчэ больш узо'ўся на мяне. Праз некаторы час у насценгазеце Белжылсаюза з'явілася заметка аб недахопах Менбудрэмканторы, узначальваемай тав. Карнейка. Карнейка палічыў і гэту заметку «справай маіх рук» і залічыў мяне з таго часу ваяўнічкова сваім заклятым ворагам.

З пачатку ліпеня я напісаў заметку ў насценгазету Белжылсаюза аб недахопах работы старшыні праўлення Белжылсаюза тав. Яўгеева. Гэта паслужыла Яўгееву поводам для сумеснага з Карнейкай наступлення на мяне. Даведаўшыся, што мяне перакідаюць на работу ў Менбудрэмканторы, тав. Карнейка пахваліўся Рушаеву: «Я тады з-яго сам скур зняру».

Мары Карнейкі не споўніліся. Іх выканаў (праўда не без ягоды Карнейкі) старшыня праўлення Белжылсаюза тав. Яўгеў. Гэта ён, прачытаўшы 3-га жніўня ў «Звязде» пісьмо «Белжылсаюз разбурае жыцьцё дзяцей», падпісанае мною і тав. Евілеўскім, тут-жа напісаў загад аб зняцці мяне з работы, як ляўтуна, эрыўшчыка работ і больш таго, як антысавецкага элемента.

Так расправіліся са мной за крытыку іх нікудышнай работы вальможы Яўгеў і Карнейка.

ГЕРЧЫКАЎ.

РЭАГАВАННЕ БЫЛО ХУТКАЕ І „ВЫЧАРПАЛЬНАЕ"

Факты, указаныя ў пісьме тав. Герчыкава пры расследаванні на месцы работнікамі рэдакцыі пацвердзіліся. Сапраўды, з жніўня, у дзень з'яўлення ў «Звязде» пісьма тав. Герчыкава «Белжылсаюз разбурае жыцьцё дзяцей», рушыў старшыні праўлення Белжылсаюза тав. Яўгеева напісан загад, якім тав. Герчыкаў — галоўны інжынер БЖС, за «ЗРЫЎ РАБОТЫ НА ПРАЦЯГУ РАДУ ГОД ЗА ЛЯТУНСТВА З ВЫТВОРЧАСЦІ І ЗА АДМАЎЛЕННЕ ВЫКАНАЦЬ ЗАГАД СТАРШЫНІ БЖС АБ ПЕРАХОДЗЕ НА РАБОТУ Ў МЕНБУДРЭМКАНТОРУ» знімаўся з работы. Тым-жа загадам прадугледжвалася аб «ЗЛАЧЫНСТВАХ» Герчыкава, занесці ў яго працоўны спіс, а аб яго «АНТЫСОВЕЦКІХ І АНТЫГРАМАДЗЯНСКІХ ДЗЕЯННЯХ ДАВЕСЦІ ДА ВЕДАМА АДПАВЕДНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯЎ».

Хто-ж такі Герчыкаў, што ён зрабіў антысавецкага і антыграмадзянскага на працягу больш 7 год сваёй работы ў БЖС і іншых будаўнічых арганізацыях?

СЫН РАБОЧАГА КРАЎЦА ТАВ. ГЕРЧЫКАЎ У 1925 ГОДЗЕ СКОНЧЫЎ ЛЕНІНГРАДСКІ ПОЛІТЭХНІЧНЫ ІНСТЫТУТ. Пасля вучобы да 1929 г. працаваў у бабруйскім аддзяленні Белдзержбуда прарабам. З 1929 г. перайшоў у БЖС у пачатку інжынерам, а з 1933 г. прызначан галоўным інжынерам. За ўвесь час сваёй работы тав. Герчыкаў не меў ні адной заўвагі, ні аднаго спагнання, акрамя пазян. НЕКАЛЬКІ РАЗ ПРЭМІРАВАЎСЯ. У 1933 годзе загадам былога старшыні БЖС тав. Шчацько спецыяльна адзначаўся прыкладная і самаадданая работа Герчыкава і ўзнімалася хадайніцтва перад ЦОПСБ аб устанаўленні яму спецстаўкі ў памеры 550 руб. у месяц.

ТАВ. ГЕРЧЫКАЎ НЕ ПРОСТА СПЕЦЫЯЛІСТ, А СПЕЦЫЯЛІСТ-АКТЫВІСТ, ГРАМАДСКІ РАБОТНІК. ЁН УВАХОДЗІЦЬ ВА ЎСЕ ДЭТАЛІ РАБОТЫ, КРЫТЫКУЕ ІХ ПРАЗ НАСЦЕННУЮ ГАЗЕТУ, ДАЕ НАПРАМАК ЯК ЗНІШЧЫЦЬ НЕДАХОПЫ.

НА НАША ПАТРАБАВАННЕ НАЗВАЦЬ ФАКТЫ АНТЫСОВЕЦКІХ І АНТЫГРАМАДСКІХ ДЗЕЯННЯЎ ГЕРЧЫКАВА КІРАЎНІКІ БЕЛЖЫЛСАЮЗА НЕ МАГЛІ СКАЗАЦЬ НІ СЛОВА. Адно, у чым бязумоўна вінават Герчыкаў, гэта ў невыкананні загаду Яўгеева аб пераходзе на работу ў Менбудрэмканторы.

Дырэктар Менбудрэмканторы тав. Карнейка ўвесь час дакладваў Белжылсаюзу, што ў яго «усё ў парадку». А на справе план рэмонту на 1-е паўгоддзе свядома зніжан на 200 тысяч рублёў, гадавы план будаўніцтва выкананы на 45 проц. План вярбоўкі рабочай сілы на 50 проц.

Кіраўнікі канторы свядома скрылі ад Белжылсаюза найўнасць атрымнай імі цэглы. Атрымалі 500 тысяч штук, а далі весткі Белжылсаюзу аб тым, што атрымалі толькі 100 тысяч. Гэта жульніцкая махінацыя зроблена для таго, каб апраўдаць зрыў плана будаўніцтва нібы з прычыны адсутнасці цэглы. Падобнага роду махінацыі кіраўнікоў Менбудрэмканторы наглядаюцца не ўпершыню.

Дый тое, што будуе Будрэмканторы не вытрымлівае ніякай крытыкі. На рамонт двухпавярховага дома па Масніцкай 19 затрацілі 45 тысяч рублёў, у якім за два дні да ўсялення жыхароў абвалілася столь. На рамонт дома па Замкавай 9 затрачана 13.600 рублёў у 1933 годзе, сёлета на гэты-ж дом затрачана яшчэ 13.000 рублёў, а дом як быў неадрамантаваным, так і застаўся. У часе закладкі фундамента дома ІТР рабочыя не раз паказвалі на тое, што плян для будаўніцтва выбран няправільна, бо ў першым-жа вырытым катлаване плавіпася вада. Але гора-кіраўнікі з Менбудрэмканторы на гэта не зварнулі ніякай увагі. У рэзультаце макрата сцен у доме дайшла ўжо да трэцяга паверха.

Герчыкаў, як галоўны інжынер, указваў не раз на ўсе гэтыя недахопы, але безрэзультатна. Карнейка не лічыў патрэбным прыслухоўвацца да ўказанняў інжынера.

На ленш працуе І Белжылсаюз. План капітальнага рэмонту па 8 гарадах Беларусі, у якіх ёсць яго філіялы, выкананы за першае паўгоддзе ўсяго на 59,3 проц. Асобна па гарадах план выканан такім чынам. Па Менску на 31,5, Барысаву 14,4, Мазыру 24,4, Оршы 13,4, Бабруйску 77 проц. і т. д. Толькі па аднаму Віцебску план выканан на 104,7 проц.

Жылёі і кладзеі пранікшыя ў апарат Белжылсаюза не атрымліваюць вынікага адпору. Наадварот, ім тут складаюць найлепшыя ўмовы і прасоўваюць на вышэйшыя пасады. Камендант БЖС Барысенак— спутніка Яўгеева, п'яніца, хуліган, растратчык 369 руб. дзяржаўных грошай — інтарэсант пастановы мясцкома аб зняцці яго з работы з адкачай пад суд, прыхільнічаў Яўгеевым загадчыкам цэнтральнай базы Белжылсаюза. Бухгалтарам БЖС працуе сын папа Перапечын, рахуншаводам Пятапоч, засуджаны на два гады пазбаўлення волі за хуліганства. У Менрэмбудканторы галоўным бухгалтарам працуе шваго Карнейкі — таксама сын папа — Садоўскі.

АБ УСІХ ГЭТЫХ ЗЛАЧЫНСТВАХ ВЕДАЮЦЬ УСЕ РАБОТНІКІ БЕЛЖЫЛСАЮЗА І РЭМКАНТОРЫ. ВЕДАЮЦЬ, АЛЕ ГАВАРЫЦЬ АДКРЫТА ПРА ГЭТА БАЯЦЦА. І не дзіўна. Бо ў апаратах гэтых арганізацый складзена абстаноўка самага грубейшага зажыму самакрытыкі. Пацвярджэннем гэтага з'яўляецца звальненне інжынера Герчыкава і адкрытае запалохванне тых работнікаў, якія напісалі абкрываючы матэрыял на Карнейку і Яўгеева ў сваю насценгазету.

Герчыкава, совецкага спецыяліста, праверанага на рабоце, вельможа Яўгеў зняў з работы, на яго месца прызначыў зусім непісьменнага дзесятніка падхаліма Вінакурава. Той-жа Яўгеў рэдактару насценнай газеты тав. Фішару загадам ад 19 жніўня павысіў зарплату, а 27, у дзень выхаду насценнай газеты з матэрыялам, крытыкуючым яго работу, загад адмяніў. А Карнейка прачытаўшы заметку адкрыта заявіў, што ён пакажа вўтару, як пісаць не яго заметкі.

Характэрна, што аб усім сказаным добра ведала партгрупа Белжылсаюза (парторг Куралаткіна), ведала, але ні лічыла сваім партыйным абавязкам умяшацца ў гэта.

МІНДЭЛЬ, ЗЕЛЬКІНД.

ПІСЬМЫ РАБОЧЫХ І КАЛГАСНІКАЎ

САКРАТАРУ ВІЦЕБСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б ТАВ. ЖУРАЎЛЕВУ

КРЫТЫКА, ЗВАЖАЮЧЫ НА АСОБЫ

(ПІСЬМО ГАЗЕТНАГА РАБОТНІКА)

У рэдакцыю газеты «Віцебскі пролетарый» селькоры з калгаса «З рашаючы год пяцігодкі», Бабінцкага сельсавета, за час з 6 па 11 мая прыслалі 3 пісьмы. Зместі ўсіх пісем адны: старшыня калгаса Крейда займаецца п'янствам з прагульшчыкі ў калгас кулакамі Сельчанкам Міронам, Мацухлінам, Антонам і цвёрдазаданнікам Мацухлінам Нічыпарам.

Мацухліна Антона, асуджанага на 3 месяцы прымусовых работ, Крейда ўзяў у калгас адбываць пакаранне. Мацухлін на работу не выходзіць, а працадні яму запісваюцца.

Крейда, як пісалі селькоры, сістэматычна займаецца растратай калгасных грошай. Ён прыняў 100 рублёў, атрыманых з банка, растраціў 100 рублёў, атрыманых з калгаса яго Мацухлін за збажы.

Пісьмы ня былі апублікаваны, а пасланы начальніку паліцэдзела Віцебскай МТС тав. Волжаву і дырэктару МТС т. Галавёнку. Праз некаторы час тав. Галавёнка паведаміў рэдакцыю, што Крейда знят з работы і аддан пад суд. Здавалася-б, чаго лепш! Рэагаванне на сутнасці. А на самай справе Крейда дырэктыў МТС перакінут з гэтага калгаса ў другі на тую-ж пасаду старшыні калгаса.

Рэдакцыя «Віцебскага пролетарыя» (рэдактар т. Курцік), атрымаўшы такі «самакрытычны» адказ, не адважылася выкрываць старонь «самакрытыкі» Галавёнка, палічыўшы, мабыць, што досыт аб самакрытыцы ёсць толькі для страляпкаў.

Работніка рэдакцыі газ. «Віцебскі пролетарый» А. ПІМІНТЗІНА.

ЗАГАДЧЫКУ КУЛЬТПРОПА МЕНГАРКОМА КП(б)Б ТАВ. ВАРОНЧАНКА

ПАЗБАВУЦЕ НАС АД ТАКОЙ СТАЛОЎКІ

(ПІСЬМО СТУДЭНТАЎ)

Сталоўка ЦРК № 4 абслугоўвае інстытут Соўправа і ВІІ. Адміністрацыя сталоўкі аб палепшэнні грамадскага харчавання і культурным абслугоўванні наведвальнікаў зусім не клапоціцца. Не гледзячы на тое, што ёсць макароны, бульба, капуста, сталоўка ўвесь час корміць сталайшчоў нікуды нявартай стравай.

Курсантам НКЮ Кажарнікаву і Рыбакову падалі адненты капусту з чарвякі. Калі па гэта заўважыў старшыня прафкома т. Яцук, повар Левін адказаў: «Вы не сабакі, можаце гыкінуць чэрвяка і з'ешчы».

Абслугоўваючы персанал сталоўкі груба адносіцца да наведвальнікаў. Старшая афіцыянтка Люба студэнтаў абзывае сабакамі. Буфетчыцы Бабіч і Жыжчуўская сістэматычна недадаюць студэнтам па 2-3 капейкі рэшты.

Загадчыку сталоўкі т. Ягорову аб усім гэтым штодзённа заяўляюць, але ён не звяртае ніякай увагі.

Ф. ЛАГУН, ГРЫГОР'ЕЎ, ШАРМАНАЎ і ЛЕЙКІН.

ГОМЕЛЬ.

У ГОРКАХ АБКРАДВАЮЦЬ ПАКУПНІКА ОПТАМ І Ў РОЗНІЦУ

ГОРКІ, 10. (Па тэлефону ад карэсп. «Звязды»).

Першы рэйд брыгады па магазінах горада Горкі выявіў злачынны малюнак.

Старшыня Горкінскага сельп Фаерман, член раўкамісіі Белін, прадавец Севярцаў сістэматычна павышалі расцэнкі на ўсе тавары, атрыманыя ад райспажыўсаюза. Так, акт № 4 гаворыць, што «на атрыманыя ад Горкінскага райсаюза па накладной № 2253 ад 25 мая 1934 г. цукеркі ў колькасці 41 кіло 590 грам коштам у 5 руб. 10 к. за кілограм, зрабілі накладанне па 1 руб. на кіло, якое запыхоквалі за магазінам».

За месяц такіх жульніцкіх актаў было складзена 8. Незаконнае накладанне сельпю за месяц дасягнула 718 руб. 82 кап.

У гарачы час уборкі, калі часа стала самым ходкім таварам, на не рабілі самавольнае накладанне. 16 чэрвеня на кожную касу (усяго 160 шт.) горацкія жулікі прыкінулі па 25 кап., а 28 чэрвеня па 75 кап.

Гэта жульніцтва з'яўляецца прамым кулацкім дзеяннем, накіраваным на зрыў уборкі.

Усё гэта стала вядома райспажыўсаюзу каля месяца назад. Аб гэтым пісала раённая газета «Ленінскі шлях». Але Фаерман, Белін, Севярцаў да гэтага часу не прыцягнуты да адказнасці, яны працуюць на сваіх пасадах і прадаўжаюць абкрадваць калгаснікаў і працоўных адасобнікаў.

Чаму так лажава арганізавана райспажыўсаюз да кулацкіх ворагаў? Таму што і там злачынна абкрадваюць пакупніка, але ўжо не ў розніцу, а оптам.

Па фактуры № 113 з Менскай міжраённай базы атрымана для яслей і пляцовак пасуды на 792 руб. 45 кап. База зрабіла скідку на 43,3 проц., г. зн. на 343 руб. 13 кап. Адпачасова зрабіла і націнку ў 36 проц. (у бюджэт)—161 руб. 32 кап. і гандлёвую націнку 17,5 проц.—78 руб. 63 кап. Такім чынам, ракіраванасцю па гэтай фактуры тавар каштаваў 689 руб. 70 кап. Што-ж робіць райспажыўсаюз? Ён накідвае 437 руб. 70 к. або кала 63 проц. сабекошту і прадае гэты тавар за 1127 руб. 40 кап.

Паказаная фактура і націнка на тавар—не выпадковасць. Па рахунку № 1204 замест 25 проц. накладанне тавара расцэнена так: сотня гусінаў каштуе 3 руб. 26 кап., прадаецца па 6 руб., люстры 4 руб. 50 кап. дзюжына, прадаюцца па 8 руб., накладанне кала 100 проц. Па гэтаму рахунку атрымала 80 люстраў па 1 руб. 71 кап. Яны ацэнены ў ... 4 руб. 50 кап. штука, накладанне 160 проц.

Пакуль тавар нападае да спажыўца праз горацкія райспажыўсаюз і сельпо ён павышаецца ў цане ў 3-4 разы.

Гэтыя злачынныя факты дзейнічаюць райспажыўсаюза, яго магазінаў, старшыні сельпо—жулікаў тыпу Фаермана—застаюцца непакаранымі таму, што раённыя арганізацыі не аддаюць дастатковай увагі каляпрацы. Райспажыўсаюз і яго пізала сетка засмечаны класава-варожымі элементамі. Фаерман знаходзіць абарону ў райспажыўсаюзе і па некалькі раз «зняты» з работы працуе і сёння.

А. МІКУЦКІ.
А. ГІЗУНТЭРМАН.

АД РЭДАКЦЫІ: «Звязда» чакае, што горацкі райпракурор неадкладна прыцягне кулакоў і злачынцаў з райсаюза і гарпо да крымінальнай адказнасці, а РК разглядзіць справу аб партыйнасці комуністаў, удзельнічаўшых або потакаўшых гэтым злачынным дзеянням.

РАДЫЁГРАМА КУЛЬТПРОПА ЦК КП(б)Б І ПАЛІТСЕКТАРА НКЗБ

Сакратарам РК КП(б)Б і начпалітаддзелаў МТС — Віцебск, Гомель, Хойнікі, Турэў, Жыткавічы, Полацк, Рэчыца, Клімавічы, Магілеў, Рагачоў, Касцюковічы, Мсціслаў, Мозыр, Заслаўль, Дзяржынск, Быхаў, Бялынічы, Ілешчаніцы, Слуцк, Копыль, Бабруйск, Асіпавічы, Лепельцы, Багоміль, Камарын.

Аддзел культуры і прапаганды ленінізма ЦК КП(б)Б, надаючы вялікае значэнне ініцыятыве, праўленай Хойніцкім РК КП(б)Б і палітаддзелам Хойніцкай МТС у звароце з адкрытым пісьмом да ўсіх РК КП(б)Б і палітаддзелаў аб разгортванні завочнай партвучобы, прапануе вам абмеркаваць гэта пісьмо і распрацаваць рад мерапрыемстваў па разгортванню ў вашым раёне завочнай партвучобы, як магутнага сродку аўладання тэорыяй марксізма-ленінізма.

Нам. загадчыка культпропа ЦК КП(б)Б ПАСЮКЕВІЧ.
Нам. нач. палітсектара МТС НКЗ БССР АЙВАЗАЎ.

АДКАЗ ГАРБАЧОВАЙ

Паважаная таварыш Галіна Гарбачова! Мы прачыталі тваю гутарку ў «Звязде», у якой ты расказваеш аб сваіх перамогах па сушцы і штабелёўцы торфу. Паведамляем табе, што і нашы брыгады маюць вяліканыя паказальнікі. Штодзённае задание выконваем на 150 проц. Брыгада Карнеевай па штабелёўцы выконвае план на 165 проц. Брыгада Рахманавай на штабелёўцы — 164,4 проц. Лепшыя ўдарніцы-тарфяніцы—Іванова, Дзеравяніна, Буланоўіч, Гагальская—не толькі перавыконваюць свае задані, але і паказваюць узоры кладкі ў штабелі. У іх не было цыкліку развалкі штабелей. На сушцы цаглін больш сухія складваюцца звізу, сырыя зверху.

Гэтых поспехаў мы дабіліся дзякуючы разгортванню социялістычнага спаборніцтва. Калі раней тт. Трыбушэўская і Еўдакімава не спраўляліся з работай, то цяпер яны з'яўляюцца лепшымі ўдарніцамі. Новых работніц мы паслалі для вучобы да Рахманавай і Карнеевай.

Ты, Галіна, правільна гаворыш, што вам трэба вучыцца культурна жыць. Нашых дзяўчат не пазнаць цяпер. У бараках чыстата і парадак, адзеты і абуты добра. Дысцыпліна высокая, на работу выходзяць своечасова.

Да нашых недахопаў трэба адносіць нячысты падбор торфу, разрыў паміж сушкай і штабелёўкай. На заводзе цяпер не заштабеляваша каля 20 тыс. тон торфу.

Мы абяцаем табе дабіцца тыхжа вынікаў, што і твая брыгада, не падкачаем. Станём сабе задачай забяспечыць сушку торфу да

На торфазводзе «Большэвік» шырока разгарнулася соцспаборніцтва тарфяніц за пярэдніцтва лажшай тарфяніцы Беларусі тав. Гарбачовай.

На фотаздымку т. ЛЕГКАЯ КУЛІНА — брыгадзір маладзёжнай брыгады на торфазводзе «Большэвік», якая выконвае план па сушцы торфу на 150-160 проц.

10 верасня, максімальна выкарыстаць кожны дзень добрай пагоды, шляхам абмену вопытам пад цягваць адстаючыя брыгады Томенка і Рамановай. Усе сілы прыкладзем, каб бесперабойна снабжаць Магілеўскую шоўкавую фабрыку высокакласным торфам.

Пішы нам па адрасу: Магілеўскі торфазавод Грабянёва. Дзяўчыся з нашай вопытам работы. Прывітанне ўсім ударнікам тваёй брыгады.

Брыгадзір рэжні Магілеўскага торфазавода імя Грабянёва: РАХМАНАВА Саша, ударніца-тарфяніца ІВАНОВА Феня, ІВАНОВА Дуня, БОРСАК Маня, КІРГІЗАВА Стася.

ЗАМЕСТ АГЛЯДУ ДРУКУ

БЕЗУДЗЕЛЬНЫЯ НАГЛЯДАЛЬНІКІ

Рэдакцыя газеты «Комунар Магілеўшчыны» відавочна не мае ніякага ўяўлення аб тым, што зараз праводзіцца месячнік абмену вопытам работы калгасных і брыгадных парторгаў.

Але гэта ўсё-ж дапусціць трудна. Трудна паверыць, што ў рэдакцыі магілеўскай газеты не чытаюць «Звязды», што работнікі «Комунара Магілеўшчыны» нічога не чулі пра месячнік, які пачаўся яшчэ з першага жніўня.

Рэдакцыя «Комунара Магілеўшчыны» (а дзе-ж быў Магілеўскі РК?) проста недаацаніла гэтай справы, не зразумела яе вялікага палітычнага значэння, і таму не ўключылася ў месячнік, абмежавалася ролай безудзельнага наглядальніка.

Яшчэ першыя дні месячніка, аб'яўленага адзелам кіруючых парторганаў ЦК КП(б)Б, Палітсектарам Наркамзема БССР і «Звяздой», красамоўна паказалі наколькі наспела жыццёвая неабходнасць абмяняцца вопытам партработы ў калгасах і калгасных брыгадах, перанесці лепшыя ўзоры партыйнай работы на ўсе калгасы і брыгады. Абмен вопытам узбройвае калгаснага і брыгаднага парторга, дапамагае ім так перабудаваць, так паставіць работу, каб забяспечыць сапраўдны большэвіцкі ўплыў, большэвіцкае выхаванне ў кожным калгасе, кожнай брыгадзе.

Раённы друк абавязан прыняць непасрэдны ўдзел у арганізацыі і разгортванні месячніка, папулярызаваць вопыт работы калгасных і брыгадных парторгаў, скарыстаць гэту справу для ўзмацнення барацьбы за хутчэйшае правядзенне ўборкі і паставак.

Але гэтай галоўнай палітычнай задачы многія газеты не зразумелі і не ажыццяўляюць на справе. «Комунар Магілеўшчыны», які зусім не ўключыўся ў месячнік, які не захацеў прадаставіць свае старонкі для выступленняў калгасных і брыгадных парторгаў, на жаль, не выключэнне. Возьмем для прыкладу «Віцебскі пролетарый» (рэдактар т. Курцік). За 14 дзён жніўня—ні слова аб праводзімым месячніку. Літаральна ні радка. Мы пытаем рэдакцыю «Віцебскага пролетарыя», гарком партыі: хіба ў Віцебскім раёне няма калгасных і брыгадных парторгаў? Ці можа ўсе яны працуюць бездакорна, і гаркам іх ужо так добра выхаваў, што яны не маюць ніякіх патрэб у абмене вопытам? Або мы маем тут справу па-просту з недаацэнкай пытанняў партыйна-масавай работы, недаацэнкай, з якой трэба неадкладна пакончыць.

Мы ўважліва прагледзелі камплект газеты «Палеская праўда» (рэдактар т. Бугроў). Што-ж аказваецца? Гэта вялікая штодзённая газета таксама ўзяла на сябе ролю безудзельнага наглядальніка.

Пра месячнік «Палеская праўда» ўспомніла толькі праз тыдзень пасля яго аб'яўлення. Ніпіто сабе апаратыўнасць... Але гэта яшчэ поўбяды. «Палеская праўда», аказваецца, успомніла пра месячнік толькі для таго, каб паказаць, што аб гэтай справе рэдакцыя чула. А канкрэтнай работай, практычным правядзеннем месячніка рэдакцыя не намерана займацца.

8 жніўня «Палеская праўда» змяшчае выступленне парторга калгаса «Чырвоны працаўнік» тав. Рубіна. Над выступленнем дасцца аншлаг: «Месячнік абмену вопытам партработы ў калгасах». Ні слова аб задачах месячніка. Ні намёку на тое, каб мабілізаваць увагу партыйнай арганізацыі вакол гэтай справы. Адным словам—абы з рук.

Далей выходзіць нумар, другі, трэці, чацверты, а ў газеце пра месячнік ні слова. Успомнілі са спазненнем на тыдзень і забылі адразу на другі-ж дзень. Красамоўны прыклад славеснай дэкларатыўнасці, нежыццёвага канкрэтна, аператыўна арганізаваць справу.

Па слядах «Палескай праўды» ідзе і «Большэвік Барысаўшчыны» (рэдактар т. Мятла). Толькі 13 жніўня «Большэвік Барысаўшчыны» ўключыўся ў месячнік абмену вопытам работы калгасных і брыгадных парторгаў. У гэты дзень газета змяшчае цікавае і каштоўнае выступленне парторга калгаса «Трэці рашаючы» тав. Шульмана.

Далей ставіцца крапка. Праходзіць дзень за днём, але пра месячнік газета больш нават не ўспамінае. Гэта красамоўна сведчыць аб тым, што «Большэвік Барысаўшчыны» ўзяў стаўку на самацёк, што газета не правяжыць вакол месячніка ніякай арганізатарскай работы.

Аршанскую-ж газету «Ленінскі прызыў» (рэдактар тав. Дамарацкі) адзін месячнік не задаволіў. Яна рашыла ўзяцца адразу за дзве справы—і за месячнік абмену вопытам работы калгасных і брыгадных парторгаў, і за месячнік абмену вопытам работы партарганізацый. Але першую і другую справу газета аўна правальвае.

Першы адзел, прысвечаны месячніку абмену вопытам работы калгасных і брыгадных парторгаў, газета дала 10 жніўня. Потым наступае зусім незразумелае маўчанне, якое прадаўжаецца і па сёння.

11 жніўня «Ленінскі прызыў» змяшчае першы адзел, прысвечаны рабоце парторгаў прадпрыемстваў. І зноў гісторыя паўтараецца. Назаўтра-ж, і па сёняшні дзень, пра месячнік у газеце не знойдзеце нічога. Вывады напрашваюцца самі. Гэтыя вывады павінны зрабіць адказныя ГК і РК.

Прагляд камплектаў «Комунара Магілеўшчыны», «Віцебскага пролетарыя», «Палескай праўды», «Большэвіка» Барысаўшчыны» і «Ленінскага прызыва» за першую палову жніўня паказвае, што гэтыя газеты не зразумелі палітычнага значэння месячніка.

Месячнік абмену вопытам калгасных і брыгадных парторгаў — справа вялікай палітычнай важнасці. Трэба неадкладна прасекці спробы ігнаравання ці недаацэнкі. Гэты месячнік павінен быць выкарыстан кожным РК, кожным палітаддзелам у мэтах рашучага паляпшэння работы парторгаў, рашучага палажэння партмасавай работы наогул.

НА „ПЛЕБІСЦЫЦЕ“ СУПРОЦЬ ГІТЛЕРА ПАДАНА ГАЛАСОЎ У ДВА РАЗЫ БОЛЬШ ЧЫМ У МІНУЛЫМ ГОДЗЕ

„ВЫНІКІ ПЛЕБІСЦЫТА“ Ў ГЕРМАНІІ

БЕРЛІН, 20 жніўня. (Прыватна радыёстанцыяй «Праўды»). Роўна ў 2 г. 15 мін. па берлінскаму часу (4 гадз. 15 мін. па маскоўскаму часу), пасля таго, як урадавае германскае радыё перадало брэхуны марш «Германская вернасць», былі паведамлены свету афіцыяльныя «вынікі плебісцыта». Да гэтага часу гэтыя «вынікі» былі запісаны толькі ў запісной кніжцы міністра прапаганды Іосіфа Гебельса. Зараз яны сталі здабыткам галоснасці.

Паводле афіцыяльных лічбаў, было падана 43.268.000 галасоў пры 45.203.000 чал., карыстаючыхся правам голаса, што адпавядае 95,7 проц. удзельнічаўшых.

За надзяленне канцлера Гітлера паўнамоцтвамі прэзідэнта і прысваенне ім звання «правадыра германскага народа» галасавала 38.260 тыс. чалавек, або 89,97 проц., супроць — 4.275.000; 679.000 галасоў налічана «несапраўдных».

Пры мінулым, праведзеным нацыянал-сацыялістамі 12 лістапада 1933 г., «плебісцыце» па пытанню аб выхадзе Германіі з Лігі нацый было падана 43,5 млн. галасоў (96,3 проц.), з якіх урад атрымаў 40,5 млн. (95,1 проц.). Прычым супроць яго было падана 2.100.765 галасоў або 4,9 проц., а «несапраўдных» галасоў аказалася 720 тыс. Пры праведзеных адначасова «выбарах» у рэйхстаг на афіцыяльных даных удзельнічала 95,2 проц. выбаршчыкаў, з якіх 92,2 проц. галасавала за нацыянал-сацыялістаў.

Янчэ да апублікавання «вынікаў плебісцыта» усяму свету было ясна, што гэтым лічбам нельга надаваць ніякага значэння. Толькі з простай цікавасці асобныя органы міжнароднага друку займаліся гаданнямі па пытанню аб тым, ці захочуць нацыянал-сацыялісты запісаць сабе большую колькасць паданых галасоў, чым тая, якая была ўказана пры «плебісцыце» 12 лістапада, або, улічваючы падзеі 25 ліпеня, яны вялікадушна згодзяцца некалькі знізіць гэтыя цыфры.

Гэта цікавасць зараз задаволена. Нельга не ацаніць па заслугах разыгрываную Гебельсам, як па нотах, камедыю. Ніхай, аднак, германскія фашысты не думаюць, што ім удасца ёю каго-небудзь ашукаць.

* * *

Не гледзячы на ўсе мары тарора, ніхто галасоў супроць Гітлера больш чым падвоіўся. Несапраўдныя галасы таксама трэба лічыць галасамі супроць Гітлера. Рост ліку галасоў супроць Гітлера з'яўляецца выражэннем РОСТУ ЎПЛЫВУ НЕЛЕГАЛЬНАЙ КОМПАРТЫІ Ў РАБОЧЫХ МАСАХ. Асабліва ярка гэта пацвярджаецца тым, што калі па ўсёй Германіі супроць Гітлера галасавалі 12,1 проц. выбаршчыкаў, то ў асобных рабочых раёнах гэты процант значна павышаўся. У прыватнасці, у Гамбургскай выбарчай акрузе супроць Гітлера галасавала 22,5 проц. выбаршчыкаў, у Берлінскай—21 проц. І т. д. У горадзе Аахене супроць Гітлера галасавала звыш 30 проц. усіх выбаршчыкаў.

КАМЕНТАРЫІ СУСВЕТНАГА ДРУКУ

Сусветны друк ажыўлена абгаварвае вынікі плебісцыта ў Германіі.

Англійскія газеты падкрэсліваюць лік галасоў, паданых супроць Гітлера. Паведамленне аб плебісцыце друкуецца пад загалоўкамі: «Гітлер траціць глебу», «Няўдача для Гітлера», «Сілы супраціўнікаў нацыянал-сацыялістаў падвоіліся».

Як указвае «Морнінг пост», рэзультаты плебісцыта сведчаць аб падзенні прэстыжу нацыянал-сацыялістаў. Не гледзячы на ўсялякі нажым і прапаганду, больш 10 процантаў насельніцтва мела смеласць сказаць «не».

Аўстрыйскі друк расцэньвае вынікі плебісцыта, як цяжкае паражэнне Гітлера. У каментарыях да паведамленняў газета «Зон ундантагцэйтунг» лічыць, што звязда... Гітлера змерла і залуляе, што ў выпадку свабоды выбараў і наяўнасці другіх кандыдатур Гітлер напэўна не быў-бы прыемнікам Гіндэнбурга.

Як цяжкае паражэнне нацыянал-сацыялізма расцэньвае рэзультаты плебісцыта і ўвесь французскі друк. Усе газеты падкрэсліваюць, што з часу мінулага плебісцыта колькасць смельчакоў, якія адважыліся ва ўмовах небывалага тэрору сказаць «не», вырасла ў два разы.

Газеты заўважаюць, што калі гэты рост пойдзе і ў далейшым такімі-ж тэмпамі, то нацыянал-сацыялістская дыктатура будзе нядоўгавечнай. Друк аднадушна заўважае варожы настрой, які панаваў у дзень плебісцыта ў рабочых кварталах Берліна.

«Юманітэ» ў каментарыях да рэзультатаў плебісцыта піша: «Не гледзячы на тэрор, 5 мільёнаў чалавек сказалі «не», ведаючы, што яны кідаюць выклік смерці. Яны праявілі мужнасць, вартую Лібкнехта і Дзімітрава, і выразілі волю народных мас Германіі, правадыром якіх з'яўляецца Тэльман».

Друк ЗША, каментуючы рэзультаты плебісцыта ў Германіі, падкрэслівае рост галасоў паданых супроць Гітлера. Галасаванне паказвае, што неадабрэнне павялічваецца. Некаторыя нацыянал-сацыялістскія службовыя асобы гавораць, што яны расчараваны рэзультатам плебісцыта.

Германскія газеты ўсяк прабуюць замазаць значэнне таго, што супроць Гітлера падана ўдвая больш галасоў, чым у мінулым годзе. На газетных старонках ярка адлюстроўваецца трывога адносна гэтага росту. (Белта).

КОМПАРТЫЯ ФРАНЦЫІ АРГАНІЗУЕ МАСАВЫЯ СХОДЫ І ДЭМАНСТРАЦЫІ Ў АБАРОНУ СССР

ПАРЫЖ, 19 жніўня. (БЕЛТА). «Юманітэ» публікуе пастанову сакратарыята ЦК компартыі Францыі, у якой выражаецца згода з прапановай Таварыства прыхільнікаў СССР аб арганізацыі сумесных дзеянняў для абароны Совецкага Саюза. Сакратарыят настойвае на арганізацыі масавых сходаў і дэманстрацый і заклікае ўсе арганізацыі компартыі ўдзельнічаць у гэтай справе разам з іншымі арганізацыямі, якія жадаюць прымкнуць да абароны СССР.

ЦК камсамола Францыі прапануе рабочай моладзі ператварыць дзень 1 верасня ў дзень адзінства дзеянняў супроць вайны. Соцыялістычная федэрацыя дэпартамента Сены ў сваёй адозве клейміць правакацыйныя дзеянні Японіі. 24 жніўня компартыя і соцыялістычная федэрацыя дэпартамента Сены арганізуюць вялікі сход у абарону СССР.

ГЕРМАНСКІ ДРУК ЗАДАВОЛЕН АБВАСТРЭННЕМ СТАНОВІШЧА НА ДАЛЁКІМ УСХОДЗЕ

БЕРЛІН, 19 жніўня. (БЕЛТА). Германскі друк на відным месцы друкуе паведамленні аб апошніх падзеях на Далёкім Усходзе, прычым замоўчвае правакацыйныя дзеянні і выступленні япона-маньчжурскіх ваенных улад і іх друку.

У той-жа час друк не хавае свайго задавальнення па поваду абвастрэння становішча на Далёкім Усходзе, разлічваючы, што гэта можа адмоўна адбіцца на знешне-палітычным становішчы СССР у Еўропе і, у прыватнасці, што гэта палегчыць барацьбу Германіі супроць Усходняга пакта.

МАСАВЫЯ ЗВАЛЬНЕННІ РАБОЧЫХ У АУСТРЫІ

ВЕНА, 19 жніўня. (БЕЛТА). Урад агаласіў «асноўны закон» аб ачыстцы прыватных прадпрыемстваў ад «антыдзяржаўных» і «антыўрадавых» элементаў. Закон прадугледжвае прыпыненне заводаў і звяцце рабочых з працы не толькі за «антыўрадавую дзейнасць», але і «за варожыя дзяржаве мыслені».

На радзе прадпрыемстваў пачаліся ўжо масавыя звальненні рабочых.

ПАЧАЛАСЯ УСЕБЕЛАРУСКАЯ СПАРТАКІЯДА ПА ЛЁГКАЙ АТЛЁТЫЦЫ

300 лепшых фізкультурнікаў БССР з'ехаліся ў Менск на Усебеларускую спартакіяду па лёгкай атлетыцы. 18 жніўня пасля парада на Усебеларускім стадыёне адбылося адкрыццё спартакіяды. Перад пачаткам спартакіяды адбыўся парад.

Хутка пачаўся футбольны матч. На футбольнае поле выйшлі дзве каманды — «Дынамо» і менская спартыўная школы. Матч закончыўся перамогай «Дынамо» з вынікам 3:0.

Пасля футбольнага матча пачалася эстафета 7 гарадоў — бег на дыстанцыі 100 метраў (для мужчын). Першае месца займае каманда Віцебска, другое — Менск, трэцяе — Гомель і Бабруйск.

Наступнай у эстафеце ўдзельнічала жаночая каманда. Першае месца заняў Менск, другое Гомель, трэцяе Віцебск.

У спартакіядзе таксама ўдзельнічае маскоўская каманда лёгкіх атлетаў у ліку 7 чалавек.

19 жніўня ўстаноўлены тры новыя ўсебеларускія рэкорды:

1) **па прыжку ў вышыню з разбегу** — тав. Сокалаў (Менск) прыгнуў на 1 метр 75 см. (ранейшы рэкорд 1 метр 70 см.);

2) **па штурханню ядра** — тав. Дароўскі пабіў рэкорд тав. Гэршкова, устаноўлены ім ў 1928 г. (11 метраў 46,5 см.). Тав. Дароўскі штурхнуў ядро на 11 метраў 87 см.;

3) **па бегу на 200 метраў** рэкорд устанавіў тав. Марозаў, прапоўшы дыстанцыю за 23,9 секунды.

На ранейшых спаборніцтвах 20 жніўня ўстаноўлены новыя ўсебеларускія рэкорды па наступных відах спорту.

Штурханне ядра (для жанчын)— т. Білецкая (Менск)—9 метраў 30 см.

Бег на 1500 метраў (для мужчын) —т. Іоніс (Віцебск)—4 мінуты 22 сек.

Бег на 5,000 метраў—т. Глушчанка (Менск)—16 мін. 30,4 сек. Лепшыя паказальнікі далі:

Па кіданню гранаты (для жанчын) т. Білецкая (Менск)—33 метры 55 см.

Прыжок у вышыню з разбегу (для жанчын)—т. Кірэева (Менск) —4 метры 28 см.

Ваенна-палявы гарадок для мужчын—т. Куканаў (Менск); ваенна-палявы гарадок для жанчын—т. Кірэева (Менск).

ЛЕПШАЕ ПРАДПРЫЕМСТВА ХАРЧОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

За ўдарную работу і выкананне пастановы ЦК ВКП(б) Віцебскі мясакамбінат занесен на ўсесаюзную чырвоную дошку. Прэміравана 15 рабочых. Ударнік кішэчнага цэха т. Брылон, які працуе на вытворчасці 30 год, прэміраван путёўкай на курорт і вылучан у знатныя людзі харчовай прамысловасці.

Мясакамбінат адным з першых у БССР выканаў ліпеньскае задание на 112 проц. Пры здыманні скуры з жывёлы брак даведзен да нуля (па плану дапускаецца 2 проц. браку). Каўбасны цэх, які раней выпускаў два гатункі калбасы, цяпер выпускае 7-8 гатункаў па стандарту. Уся выпрацаваная прадукцыя праходзіць хімічны і бактэрыялагічны аналіз.

КАМІСІЯ ПА СПРАВАХ БЫЛЫХ ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ

Прэзідыум ЦВК БССР зацвердзіў камісію па справах былых чырвоных гвардзейцаў і чырвоных партызан у складзе наступных таварышоў: Ляўноў М. А. (старшыня), Кандакоў Я. І. (адказны сакратар), Звёздачкін М. А., Запескі В. І., Адзінцоў Л. Е., Ашан І. Ю. і Юргенсон Р. П.

Дзень авіяцыі ў БССР

ВАЕНІЗАВАНЫ КОМСАМОЛЬСКІ ПАХОД

ВІЦЕБСК, 19 жніўня. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

У дзень авіяцыі—18 жніўня—у Віцебску адбыўся масавы ваенізаваны комсамольскі паход, у якім прынялі ўдзел 4000 комсамольцаў і рабочай моладзі. Тыма паходу: марш пад нагрозай пазітранга нашаму праціўніку ў прадбачанні сутычкі з праціўнікам.

У маршы былі пакіданы армейскія формы паштэботы: у часе прыпалаў пальтаўрадзкі і комсамольскія арганізатары праводзілі гутаркі і чытку газет, выпускаліся палодныя газеты.

Пасля паходу на грамадзянскім аэрадроме адбыўся мітынг, на якім выступаў сакратар гаркома КП(б)Б тав. Жураўлёў. Потым адбыліся палёты на самалётах лепшых ударнікаў фабрык і заводаў, быў паказан выпрыгны пілатаж, палёты планераў і прыжкі з парашутамі.

А. ЗАРУБЕЖНЫ.

ВЫСОКАЯКАСНАЕ ВАЛАКНО—ДЗЯРЖАВЕ

СЯННО, 19 жніўня. (БЕЛТА).

На 18 жніўня гадавы план здачы ільнанасення дзяржаве па раёну выкананы на 76,6 проц.

У адказ на дзень авіяцыі калгас «Совецкая Беларусь», Падворыцкага сельсовета, 17 жніўня здаў заготільну першыя 100 кгр. ільнавалакна новага ўраджаю 12-14 нумарамі.

Рад калгасаў Сідаравіцкага сельсовета дзень авіяцыі адзначылі здачай першых партый ільнавалакна дзяржаве. Калгас імя Карла Маркса здаў 12 кілограмаў 14 нумарам і 12 кілограмаў 16 нумарам. Калгас «Перамога» здаў 286 кілограмаў ільнавалакна 10-12-14 нумарамі. У гэтым калгасе на апрацоўку ільну пераключана 120 жанчын. Усяго ў дзень авіяцыі здадзена дзяржаве 367,5 кгр. ільнавалакна.

СМЕЛА ПРЫГАЙЦЕ, ТАВАРЫШЫ!

Я зняў'у рэд вірві. У кабіну я прыйшоў з пяцнаццы, дзе слухаў дзесяць гадоў. Мяне захапіла парашутная справа, і я разлічаўся з сядзом. Пачалася путоба. Я дакладна вымучыў парашут і падрыхтаваўся да першага свайго прыжка.

Памятаю зімовы дзень у лютым 1933 года. Я падышоў да самалёта. Ён быў гатовы да ўзлёту. Прагрэлер уздымаў цялае воблака снегу. І тут я крыху адаў. Я адчуў, што губляю упэўненасць. Галоўным чынам я шкадаваў аб адным: ці змагу адкрыць парашут? На сутнасці гэта і ёсць самае галоўнае.

І вось, я сяду у кабіну. Самалёт трахнуўся ўперад, ледзяны струмень паветра ахапіў твар. Больш ду маць не было часу. Я ляцеў на аэрадром, на грэку людзей, што застаўся ўнізе. Я ніць прыбіжна спрабаваў вызначыць месца прызямлення. Самалёт набіраў вышыню, потым зрабіў заход, і пярэдняе лётчык падаў сігнал.

Я ўстаў і паўтарыў усё тое, чаму вучылі мяне ў школе. І вось я чакаю апошняга сігнала. Лётчык падаў яго. Я адчапіўся ад мамыны і рынуў уніз у гуле і свісце паветра. Парашут хлопнуў адразу-ж. Мяне ўстрэсанула. Адразу спынілася падзенне, гул і свіст. Стала ціха. Я вісеў у паветры. Парашут павалу ішоў уніз. Белае поле аэрадрома набліжалася.

І тады мяне ахапіла тое пачуццё, якое заўсёды ахапвае мяне 1 разам, пасля многіх дзесяткаў парашутных прыжкоў. Гэта пачуццё радасці. Не такая, звычайная, радасць за сябе, за адзнаку, за ўдачу. Гэта— высокая радасць, урачыстая радасць за ўсіх людзей свайго калектыва, за партыю, якая выхавала мя не і дала мне сілу, вялікую сілу перамогі над паветрам. Ляжала ўніз аснежаная зямля, і маленькімі, крыху сменшымі, камочкамі здаваліся мне фігуры дарагіх мне людзей: таварышоў, камандзіраў, якія чакалі майго прызямлення, каб вітаваць в першым прыжком. А вітаваць было в чым: у гэты дзень я капчаткова падпарадкаваў сваёй волі ўсе пачуцці. Гэта гісторыя факт.

І таму я не адчуў разгубленасці пры паўторным прыжку. Было 80 градусаў марозу. Калі я адарваўся ад машыны і вырваў кальцо, парашут выцягнуўся «каўбаскай», і я ляцеў насустрач зямлі. У такім стане я праляцеў 600 метраў. Гэта быў мой невялікі заціжны прыжок. Я ўсё-ж такі палаадзіў з парашутам, бо падпарадкаваўся мне, і я надзвычай удала прызямліўся.

Часта сустракаем падзячныя пагрэбальныя погляды людзей на рынку і небяспеку парашутнай справы. Пакольку я зрабіў уже 77 прыжкоў, я хачу сабе ў правах пазнаць сваю думку на гэтую пытанню.

Усё залежыць ад работы чалавека над сабой. Трэба вывучыць ўладаць сваім целам, сваімі нервамі і думкамі пры вольным падзенні. Трэба дабіцца таго, каб адчуваць сябе поўным гаспадаром у паветры нават пры заціжных прыжках на ўмовах максімальна хуткага падзення. І тады можна перайсці да прыжкоў з фігур: віражы, спіралі, віхраванні. Тады вы адчуваеце палёт. Парашут-на адкрыццё разбіты.

Усё залежыць ад тэнпэрэнту, ад выхавання волі, ад барацьбы за тое, каб увесь загадаць самому сабе 1 дабіцца выхавання загада. Новыя кадры парашутыстаў вытрымаюць з кожным днём. Парашютызм расце і будзе расці.

Отрад перамагаецца воляю.
Смела прыгайце, таварышы!

В. БАЎЫРЭЙ.

(Інструктар парашутнай спартыўнай)

НА КІРМАШЫ-НАРАДЗЕ

РЭАЛІЗАВАНА ПРАДУКЦЫІ БОЛЬШ, ЧЫМ НА 6 МІЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ

Учора ўсебеларуская кірмаш-нарада закончыла сваю работу. Кірмаш прайшоў здавальняюча. Па папярэдніх выніках рэалізавана тавараў, выяўленых у парадку мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, больш чым на два мільёны рублёў, няходкай таварнай прадукцыі больш чым на 4 мільёна руб. У здзелках прымалі ўдзел каля тысячы арганізацый.

З агульнай сумы прадстаўленых тавараў у 16.300 тыс. руб. рэалізавана тавараў больш чым на 6,5 млн. руб. Такім чынам мёртвы капітал ажыццёўлен амаль на 30 проц.

Аднак, рэзультаты нарады былі б больш эфектыўнымі, калі б яны беларускія арганізацыі прымалі ў ёй больш актыўны ўдзел. Белдзяржбуд, Сантэхбуд мелі магчымасць купіць цэлы рад дэфіцытных тавараў, на якія яны ў звычайны час давалі шматразовыя заяўкі. Але ў сувязі з тым, што на кірмаш яны не з'явіліся, гэтыя тавары былі прададзены не беларускім арганізацыям. Лесдрэўхіму даўно патрэбен грузавы аўтамабіль. Але з прычыны таго, што Лесдрэўхім у кірмашы не ўдзельнічаў, грузавы аўтамабіль быў прадан другім.

Трэба адзначыць, што ў часе кірмаша таксама ўскрыта дрэнная работа нашых снабжэнчых арганізацый і бясстыдная пастаянная ўчоту. Так, представнік завода імя Варашылава ўжо падпісаў здзелку на тыя-ж самыя гайкі да балтоў, якія ён некалькі дзён назад паслаў на кірмаш для рэалізацыі. Белкурторт купіў на кірмашы іголкі, крэй спаўленых рымарный фабрыкай, для забеспячэння гэтай-жа самай фабрыкі і т. д.

Кірмаш, бясспрэчна, апраўдаў сябе. І на сёмстні дзень ўстае пытанне аб дзяйсным арганізацыі нарад-кірмашоў у больш перыядычным тэмпы, у больш вузкім, міжраённым маштабе. Гэта дасць яшчэ больш эфект у сэнсе мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў і рэалізацыі ходкіх тавараў у даных умовах.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

23 жніўня адбудзецца ГАРАДСКІ КОМСАМОЛЬСКІ АКТЫЎ з дакладам аб XX міжнародным юнацкім дні сакратара КІМА тав. ЧЭМАДАНАВА.

Актыў адбудзецца ў Доме партактыву ў 6 гадз. вечара.

Усім сакратарам комітэтаў прадставіць спісы ў ГК ЛКСМБ, на якіх адзначыць білеты ў агульнасці адказага ГК ЛКСМБ.

МЕНГАРКОМ ЛКСМБ.

Адказны рэдактар Н. ЛЕНЦНЕР.

Памяшк. БДТ—1. Бел. Дзярж. Тэатр ОПЕРЫ і БАЛЕТА
Мастацкі кіраўн. засл. арт. рэспубл. Гіттарц І. А.
СЬНЯ, 21 жніўня ДЛЯ ГАРАНА
БАЛЕТ „ЧЫРВОНЫ МАК“
Пачатак роўна ў 6 г. веч. Білеты ў ГАРАНА.

Першы Дзяржаўны Тэатр (БДТ—1)
Мест. кір. засл. арт. рэсп. Л. М. ЛІТВІНАЎ
верасня 1934 г. Пачатак сезона 1934-35 г.
Н. Крапіва.
КАНЕЦ ДРУЖБЫ
драма ў 4 дзеях.
Прэміравана на конкурсе БССР.
Заўжы на жыватнага спектакль прымаюцца тэатры і ў раб. касе.

Рукавы кіно-тэатр „Чырвоная Зорка“. Замежная камедыя СТУК у ДЗВЕРЫ На эстрадзе—КАНЦЭТЫ

Кіно „Інтэрнацыянал“ Совецкі маставы фільм Бенефіс клоўна Жоржа

Кіно СПАРТАК“ Выдатны маставы фільм ДЭКАБРЫСТЫ Драма ў 8 частках.

Беларускі сельска-гаспадарчы інстытут НКСнаба
аб'яўляе НАБОР СТУДЭНТАЎ
на факультэты: ветэрынарны агра - інжынерны, агра - эканамічны і інжынераў-механікаў.
Да іспытаў у інстытут (па мове, матэматыцы, фізіцы, хіміі, біялогіі і гісторыі краіўства) у аб'ёме закончанай сярэдняй школы дапускаюцца асобы ад 18 да 3 год.
Да заявы трэба дадаць дакументы пашпарт, вайсковы білет, аб соцстаноўчы і паходжанні, анкету (паводле станоўленай формы) засведчаную адпаведнымі ўстановамі, даведку аб стане здароўя, 2 фотакарткі.
Іспыты—з 15 верасня.
Заявы—да 15 верасня. Пачатак занятку 1 кастрычніка.
Інстытут забяспечвае студэнтаў інтэрнатам, сталовай і павышанай стыпендыяй з акадэмічнасяховаскі. Стыпендыя дасцца ўсім студэнтам новага набору.
Асобы, недастаткова падрыхтаваныя ў сваіх гадах, могуць на працягу месяца да прыёму іспытаў вярыстацца пры інстытуце кансультацыямі настаўнікаў персанала і бібліятэкі інстытута.
За ўсякімі даведкамі аб прыёме звяртацца ў прыемлярыю вучэбнага камбіната г. Белая Церковь, Киевской обл., площадь Свободы № 4.
Дырэкцыя.

Да ведама старшынь ячэек МОПР г. Менска.
22 жніўня ў 7 гадзін вечара адбудзецца
Інтэрнацыянальны вечар
старшынь, сакратароў ячэек МОПР'а і зборшчыкаў членскіх узносаў
па пытанню
фінансавага становішча арганізацый і падрыхтоўкі да пленума ЦК МОПР СССР, на якім будзе даклад ЦК МОПР БССР.
На інтэрнацыянальным вечары выступіць старшыня рэвізійнай камісіі ЦК МОПР СССР т. Чэрнамордзін.
Інтэрнацыянальны вечар адбудзецца ў сталоўцы партактыва № 1 (Совецкая, 69) за чашкай чаю.
Старшыні ячэек МОПР павінны атрымаць запрашальныя білеты ў ЦК МОПР БССР (Совецкая, 87, другі паверх).
Старшыня ЦК МОПР
Акад. ДОМБАЛЬ.

Гомельскі дзяржаўны педагагічны інстытут
аб'яўляе
КОНКУРС
на замяшчэнне вакантных пасад па польскаму сектару (выкладанне на польскай мове):
1. Прафесара фізікі . . . 1
2. Дацэнта 1
3. Асістэнта 1
4. Дацэнта хіміі 1
5. Асістэнта 1
6. Прафесара біялогіі . . 1
7. Дацэнта 1
8. Асістэнта біялогіі . . 1
9. Асістэнта батанікі . . 1
10. Прафесара матэматыкі . 1
11. Дацэнтаў матэматыкі . 2
12. Настаўніка польскай мовы . 1
Заявы падаюцца на імя дырэктара ці па адрасу: БССР, гор. Гомель, Пролетарская, 2.
ТЭРМІН падачы заяў да 1 верасня.
Да заяў трэба дадаць: аўтабіяграфію, дакументы аб завяршэнні ў вучэбным званні, пералік навуковых работ з водзывам аб іх, водзывы навуковых арганізацый.
Прынятым забяспечваюцца:
1) зарплатай не менш адной ставкі —прафес.—450 р., дацэнт—375 руб., 2) пад'ёмнымі і праездным па КЗАП, 3) кватэрай.
Дырэкцыя.

ДЗЯРЖЦЫРК
ПРЫБЫЛІ з ЗАГРАНІЦЫ і ВЫСТУПЛЯЮЦЬ
КІТАЙСКАЯ ТРУПА.
Прадпрыемствам гастролей Бухарскай трупы КАДЫР-ГУЛЯМ
І ўся новая праграма. ПАЧАТАК у 9 гадзін вечара.
24 жніўня ў 2 гадз. дня РАНІШНІК пры ўдзеле ўсіх артыстаў і па зніжаных цэнах.

Галоўнае кіраўніцтва адзінай гідраметэаралагічнай службы БССР
прыступае да ўліку запатрабаванняў
У ГІДРАЛАГІЧНЫХ І МЕТЭАРАЛАГІЧНЫХ ПРЫЛАДАХ на 1935 г.
Усе установы і арганізацыі зацікаўленыя ў набыцці адпаведных гідраметэаралагічных прыбораў
павінны падаць свае ЗАЯЎКІ не пазней 25-VIII—34 г. па адрасу: гор. Менск, К Маркса, 48, Гк АГМС, ГК АГМС.

Менскі Вышэйшы педагагічны інстытут
ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТО
паступаючыя ў інстытут і не атрымаўшыя паведамлення аб яўцы на іспыты
павінны з'явіцца
ў інстытут 26 жніўня для здачы іспытаў.
ДЫРЭКЦЫЯ.

ПАСТАНОВА № 14.

Прэзідыума Менскага Гарадскога Совета

ад 17 жніўня 1934 г.

У сувязі з неабходнасцю забеспячэння гароднінай-садавінай і захавання яе на зіму для рабочага снабжэння

Прэзідыум Менскага гарадскога совета ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Абавязаць ЖАКТы і ЖВКТ пад асабістую адказнасць стар шынь, уласнікаў дамоў, камендантаў, загадчыкаў дамоў і ўстаноў на працягу 5-цідзённага тэрміну, не цяней 25 жніўня, прадставіць Горснабу спісы падвальных памяшканняў з паказаннем вуліцы, нумара дамоў, кімі і чым занят і якой ёмкасці падвалпограб.

Асобы, вінаватыя ў невыкананні гэтай пастановы, будуць прыцягвацца да адказнасці.

Старшыня Менгорсовета ЖУКОВІЧ.
Сакратар Менгорсовета ЗАМБЖЫЦКІ.

З 20 па 23 жніўня адбудзецца
КАНФЕРЭНЦЫЯ НАСТАЎНІКАЎ
сярэдніх і няпоўных сярэдніх школ г. Менска
і з 25 па 28 жніўня КАНФЕРЭНЦЫЯ НАСТАЎНІКАЎ
пачатковых і няпоўных сярэдніх школ Менск. р-на.
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Вынікі работы школ за мінулы 1933—34 навучальны год і вынікі падрыхтоўкі матэрыяльнай базы школ да новага навучальнага 1934-35 г. (дакл. МУЗНЯЦОВА). Сведаклады дырэктароў школ 4, 13 і 28 на гарадской канферэнцыі і на канферэнцыі настаўнікаў раёна—Прылуцкай, Логава-Слабодской няпоўных сярэдніх школ і Лошыцкай 4 кампдэктнай школы (Прыгарадняга сельсовета).
2. Задачы новага навучальнага года (дакл. ЧАРНУШЭВІЧ).
3. Работа секцый.
Просьба на ўсіх шэфствуючых арганізацый прадпрыемстваў, саўгасаў, калгасаў, МТС прымаць удзел у рабоце канферэнцый.
Канферэнцыі адбудуцца ў памяшканні 2-ой і 5-ай сярэдніх школ (Ленінская 21, сакрэтарыят).
Пачатак у 5 гадз вечара.
Зав. МенгарАНО КУЗНЯЦОВА.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ДАВОДЗІЦЦА ДА ВЕДАМА УСІХ ПАДПІСЧЫКАЎ НА ПОЎНЫ ЗБОР ТВОРАЎ ЛЕНІНА, што

партвыдавецтва прыступіла да друкавання падасланых падпісчыкам тамоў

ДРУГОГА і ТРЭЦЯГА ВЫДАННЯ.

Прымаючы пад увагу, што за апошнія тры гады падпісчыкі маглі перамяніць свой адрас або набыць кнігу пакіна нашай экспедыцыі, просім падпісчыкаў, жадаючых атрымаць неатрыманыя тамы твораў Леніна, запаўняць адзаны купон і пасляць па адрасу: Менск, Совецкая, 41-12. Аддзел падпісных і перыядычных выданняў КОГІЗ'а.

У таблічцы закрэслены № № маючыхся ў вас тамоў, каб мы бесперашкодна дасылалі сапраўды неатрыманыя вамі кнігі.

АДРАЗНЫ КУПОН

Вырэж, запоўні, улажы ў канверт і пашлі па адрасу.

Дзе падпісаўся на твор, гор _____
Адкуль атрымаў апошні том? _____
№№ заказу або наклейкі на вокладцы _____
Дакладны паштовы адрас, куды накіроўваць кнігі _____

Закрэслі маючыяся ў цябе кнігі, 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 8, 9, 10, 11, 12, 13, 14, 15, 16, 17, 18, 19, 20, 21, 22, 23, 24, 25, 26, 27, 28, 29, 30

Подпіс падпісчыка _____

Беларускі дзяржаўны тэатр „Юнага глядача“
аб'яўляе ПРЫЁМ
у дапаможны і актёрскі склад
асоб абодвага полу ад 18 да 35 год. і прыём адбудзецца 25 жніўня у Гомелі ў памяшканні тэатра цырка:
29 жніўня ў Магілеве ў памяшканні тэатра;
2 верасня ў Віцебску ў тэатры
і 6 верасня ў Менску, (вул. Карла Маркса, 13-15, памяшканне БелТЮГМ).
Да іспытаў трэба падрыхтаваць расказ, байку і верш.
Да заяў неабходна прыкласці дакументы аб соцстаноўчасці, пашпарт, даведку аб адукацыі (не ніжэй сямігодкі) і аб стане здароўя.
Дакументы прымаюцца па ўказаных дні і памяшканнях ад 10 гадзін раніцы да 12 гадзін дня.
Даведкі аб прыёмах камісіі дае на месцы.
ДЫРЭКЦЫЯ.

ДЗІЦЯЧЫЯ САДЫ гор. Менска
з 15 жніўня 1934 г.
адкрылі ПРЫЁМ дзяцей
дашкольнага ўзросту з 4 да 7 год.
Фабрычныя, пасялковы, калгасныя і інш. арганізацыі, плацяць ПАЗІЧНЫ ПАДАТАК У ГАРАНА АБ ЗАБЕЗПЕЧАВАННІ ЗА ІМІ ПОЎНАЙ КОЛЬКАСЦІ ДАШКОЛЬНЫХ МЕСЦ.
Зав. Гарана КУЗНЯЦОВА.

ЗГУБЛЕНА круглая пячатка ад мастоцкага сельсавета. Сні дзіцячага раёна, і чыць несапраўдным.

Выпускаючы — А. КРУЧКОЎ, ст. карэктар—БЯРОЗАВІК, ст. метранпаж—Н. ПЕРАК[illegible] ст. стэрэатып[illegible] КАГАН, ст. друкар—З. РУБІН.

Менск, друкарня «Звязды».

Уп. Галоўлітбела № К—3183.